Леў Парэмскі

# АДЦЕННІ



Леў Парэмскі

# АДЦЕННІ

*Вершы*

Мінск
«Кнігазбор»
2009

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
П18

**Парэмскі, Л.**

П18 Адценні : вершы / Леў Парэмскі. — Мінск : Кнігазбор, 2009. — 108 с.
ISBN 978-985-6930-10-5.

Новая кніга Льва Парэмскага цікавая яго роздумам не толькі аб сучасным жыцці чалавецтва, але і аб яго будучыні. Душа лірычнага героя — нібыта поры года: то ясная і празрыстая, то сумная і задуменная…

Аб тым, як маленькі хлопчык усведамляў вайну, расказвае «Паэма аб несвядомасці», дзе дзіўным чынам пераплятаецца трагічнае з вясёлым.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-6930-10-5**

© Парэмскі Л., 2009
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2009

*Я навек адну задумаў тэму,*
*Аб адным пішу заўсёды я:*
*Родны край — адзіная паэма,*
*Родны край — паэзія мая.*

# I

# НЕ ПАГАСІ ЗАРУ, МОЙ СВЕЦЕ!

## 1

І быў мне сон... Не асвятліла далі
На золку сонца. Не дала імгла.
Спрэс падаў пыл. Вакол усе каналі.
Нібы ў Пампеі, гібель надышла.

Танула ўсё, бы ў попеле, у пыле,
Губіў усіх ён тоўшчаю сваёй...
З усімі разам быў і я не ў сіле
Сябе выгрэбваць з глыбі пылавой.

І, тонучы, я думаў з гаркатою:
Хто ж адкапае нас, як пампеян,
З-пад пылу ў ледавік мо таўшынёю
І ўведае што-кольвек пра зямлян?

## 2

Няўжо твайго свяціла ззянне
Прыцьміць няшчадна тэхнасфера?
І для цябе тады настане
Святла пазбаўленая эра?

І не падорадь луг і поле
Букеты яркія нікому?
І ў непрывабны шэры колер
Усё пяройдзе пакрыёма?

І ў небе зоркі не засвецяць,
Не здзівіць поўня зіхатою?..
О, супакой мяне, мой свеце,
Наступнай светлаю зарою!

### 3

Ты мне блізкі і нязнаны,
Поўны цемры і святла...
На табе дабра манбланы,
Эверэсты бед і зла...
На табе — людскія мроі,
Думак вечных каламуць...
На табе — і горы зброі,
І яны штодзень растуць.

### 4

Які зарад! Якая сіла!
Які забойства арсенал!
Дваццатай часткі мо хапіла б,
Каб чалавецтва — напавал.

Ты ж, свеце мой, з такім зарадам,
Выпісваючы дымны след,
Ляціш пагібельным снарадам...
Ды мо не скаланеш Сусвет?

### 5

Мой свеце, ты ж мо не загінеш?
Ці грымне страшнае святло?
Якім нарэшце будзе фініш?
Што возьме верх — дабро ці зло?

Прыводзіць роздум да адчаю,
Згрызот, душэўнай пустаты…
Але ў наступнае гукаеш
Сваёй нязведанасцю ты.

**6**

Пыл тэхнасферы — неўтаймоўны,
І сонца засціцца пагляд.
А я, мой свеце, усё роўна
Тваім тэхнічным дзівам рад.

І я быў рад прыдбаць машыну
І да прыроды скіраваць…
Як гэтай радасці прычыну,
Мой любы свеце, разгадаць?

**7**

Яны ляцяць. Імкліва і няспынна
Часовыя мінаюць паясы.
І ловіць касманаўцкая кабіна
Здаля твае, мой свеце, галасы.

Ужо здаецца: стаўся космас блізкі,
Скарае чалавецтва вышыню…
Дык хай яно з цябе, сваёй калыскі,
Памкне ў Сусвет адзіна дабрыню!

## II

# ТУТ УСЁ ДАРАГОЕ

**1**

Тут усё дарагое: залевы,
Пыл дарожны, мяцеліцы дым...
Тут маё радаслоўнае дрэва,
Я — маленькі лісточак на ім.

Сустракаю вятрыскі і буры,
Промні сонца і шчасця лаўлю...
А сарве мяне раптам віхура —
Дык у родную ж кану зямлю.

**2**

Завуць лясы, палёў разлогі,
Сцяжынкі ўтульныя глушы...
Мне краю роднага дарогі —
Бальзам спрадвечны для душы.

Іду і бальшаком, і гаццю,
Сам здабываю свой настрой...
Няўрымслівасць — маё багацце,
А беднасць — гэта мой спакой.

**3**

І гаі мне ў радасць, і балоты,
Рэк павольнасць, кветкавы палон.
І над полем жаўруковы ўзлёты,
І ў дуброве раўчуковы звон.

Тут жывуць заўжды мае ўспаміны,
І лячу я ў свет мне дарагі
То на крылах радасці дзяцінай,
То на крылах смутку і тугі.

**4**

Бачу: мама маладая,
Я — зусім яшчэ хлапчук —
То над мамай узлятаю,
То лячу ў пяшчоту рук.

Мы абое ў захапленні,
Дух займае ў абаіх…
І да мамы прыцягненне,
І да неба ў гэты міг.

Памяць светлая вяртае
Праз гады пяшчоту рук…
Мама — быццам маладая,
Я — зусім яшчэ хлапчук.

**5**

Узляталі арэлі
Да страхі і вышэй,
Да змяркання звінелі
Смех і крыкі дзяцей.

Папацёмку — дадому,
Зарапад — наўздагон…
О, шчаслівая стома,
Быстралёт юных дзён!

**6**

Плача мама, калі скрыпка плача —
Зблізку ці здалёк гучыць яна…
Плача мама неўпрыкмет… І значыць,
Мучыць зноўку сэрца ёй вайна.

І ніяк ёй скруху не адужаць…
Скрыпка ўмее з жалем нагадаць,
Што з вайны няма ў матулі мужа
І што мне без бацькі векаваць.

**7**

Выпаў цяжкі лёс матулі.
Нас было ў яе чацвёра…
Не давалі зменшыць гора
Роднай часта нашы гулі.

Быццам не была ў спачыне.
Не прымала сэрцам кволасць —
Днём касіла і палола,
Ноччу шыла на машыне.

Ды парою той бядачай
Не хапала нам апраткі…
А на той, што мелі, латкі
Нашывала скрозь нястача.

Каб нядолі дні мінулі,
Каб жыццё мілейшым стала,
Разам з рупнаю матуляй
Хлеб машына зарабляла.

**8**

Мы вазілі ў санках дровы,
Мы вазілі на сабе.
Нашы маці — скрозь удовы,
Не забудзешся ў гульбе.

Хоць ніхто нас не супоніў,
Мы, зусім не для пацех,
Упрагаліся, бы коні,
І мясілі цяжка снег.

Іншы раз мяце завея
І кусаецца мароз,
Мы ж, малыя, як пігмеі,
Гнёмся ў крук ды цягнем воз.

Зараслі даўно дзялянкі
Там, дзе секлі сухастой…
Ды павее снег — і санкі
Быццам зноўку за спіной.

**9**

Вяргіні ў гародчыку пышна цвілі
І столькі было прыгажосці
На лапіку роднай бацькоўскай зямлі,
Куды мы спяшаліся ў госці.

І радасна мама страчала гасцей,
І ўсплаквала — лёгка, не горка...
І ўсіх нас: і ўнукаў яе, і дзяцей
Адразу яднала гаворка.

І веялі сцены на нас цеплынёй —
Быў май на дварэ альбо студзень...
І мы забываліся цеснай сям'ёй,
Што гэтак бясконца не будзе.

**10**

Святло не ўспыхне ў цётчыным акне,
Маснічыны не рыпнуць у пакоі...
Ніхто ўжо не абрадуецца мне
На ціхай вулцы вёсачкі лясное.

Цяпер ужо да роднай цёткі шлях
Паміж крыжоў і соснаў пралягае...
Вось, цётка Надзя, я ў цябе ў гасцях.
Чаму ж маўчыш... заўсёды гаваркая?

**11**

Ужо не сходзім у суніцы,
Баравікоў не набяром...
Не ўгледзіць госця са сталіцы
Твой апусцелы раптам дом.

Мне болей радасці не будзе
Па лесе выйсці да сяла,
Дзе добрыя сустрэнуць людзі,
Дзе роднай толькі ты была.

## 12

Усё, здаецца, мела ад эпохі:
Машыны, электрычнае святло...
Але гады спустошылі патрохі
Яго, маё любімае сяло.

І толькі лес вакол — былы, суровы...
А той гаёк, што ростам быў з мяне,
Падняўся, стаў вышэзнаю дубровай —
Вятрыска не ўсялякі ўскалыхне.

І рэчкі Сушкі плёскат ціхаплынны
Надвое дзеліць поплаў, як заўжды...
І мне ўспамінаў горкія плады
Перабіваюць слодыччу маліны.

## 13

Яшчэ не выцвілі нябёсы,
Не адзіхоцеў шоўк травы,
У рэчцы не плытчэюць плёсы,
Не хіліць пушча галавы,
Не ціхнуць спевы жаўруковы,
Не моўкне пошчак салаўёў...
Ды ўжо не ўчуць тут роднай мовы,
Знаёмых кольвек галасоў...
Бо вёскі ўжо няма...
Ні хаты
Ён не збярог, мой родны кут...
Стаю, нібыта вінаваты
За ўсе ў гадах мінулых страты,
За сум, што пасяліўся тут.

## 14

Усход ружовіць плёс рачулкі,
Стаяць кусты ў гірляндах рос.
Чуцён салоўкі пошчак гулкі...
Дзе ж дуб, што тут калісьці рос?
Той, што цярплівы і лагодны
Быў да дзяцей, да іх забаў,
Што ў дзень пахмурны і пагодны
Маё маленства атуляў.
І быў паранены снарадам,
Прыкрыўшы вёску ад яго,
І пад маланкамі не падаў —
Не траціў гонару свайго...
Заўжды ён упрыгожваў дол.
Аднак даўно ўжо спілаваны.
Застаўся толькі, быццам стол,
Шырокі пень ад велікана.
Над ім з пахілай галавою
Стаю і бачу: між галля
Ужо ўзнялося немаўля —
Дубок, аблашчаны вясною.
І ўжо я думаю міжволі,
Што ёсць і тут жыцця працяг —
Дубок паднімецца ў прасцяг
І мо зазнае лепшай долі.

## 15

Вось мне зязюля пракувала
Аб тым, што майскай цеплынёй
Павеяў поўдзень і што мала
Гасціць мне на зямлі маёй.

О ты, зязюльчына куванне
На ўлонні дарагіх мясцін!
Ты — год пражытых шкадаванне,
Аб даўнім шчасці напамін.

**16**

Тут усё дарагое: палеткі,
Радасць працы на ранняй сяўбе
І зямлі прыхарошванне ў кветкі...
Тут усё, мой зямляк, для цябе.

І ці спеў над табой жаўруковы,
Ці ты ў тлуме ідзеш гарадскім —
Хай заўжды беларуская мова
Спадарожнікам будзе тваім!

**17**

О, край беларускі! О, родная мова!
З даброццяў найлепшае ў свеце дабро.
Вы — самая моцная ў лёсе аснова,
Цвярдзейшае ў атамах сэрца ядро.

А тым, хто трываласць такую губляе,
Хто можа зрачыся сваіх каранёў,
Адумацца, покуль не позна, я раю,
Як з прочак вярнуцца прашу я дамоў!

# III

# ШТО ТЫ НАКАНУЕШ МНЕ, ЖЫЦЦЁ?

◈ ◈ ◈

Мая душа — нібыта поры года,
Маёй душы ўласцівы змены дня…
Ёй любыя і майская лагода,
І зімніх сцюж выццё і валтузня.

Ёй пераходы рэзкія ўласцівы,
Панылаcці і радасці зліццё…
Ёй то баліць, то робіцца гулліва —
Як пажадаеш ты таго, жыццё.

◈ ◈ ◈

У кожнага свае заўжды памкненні,
Спакой душы і думак мітусня,
Свае няўдачы і свае здзяйсненні,
Падзенняў боль і ўзлётаў вышыня.

І я ўзнімаўся і балюча падаў,
Рахунак звесці быў гатоў з жыццём…
Ды як жа быў усцешаны і рады,
Калі вяла дарога на пад'ём!

◈ ◈ ◈

Калі бядотаю сваёю
Чужую закрану бяду, —
Як хутка я з чужой душою
Адну гаворку завяду.

І хоць інакшым свет не стане,
Хоць не паменее бяды,
А як на шчырасць
чуласць гляне —
У сэрцы ўбавіцца нуды.

◈ ◈ ◈

Я палёгку ў жыцці
Раптам стрэнуць баюся,
Бо так лёгка прыйсці
За лагодаю
скрусе.

Бо так здзеклівa ў нас
Могуць радасць украсці,
Што заменіць ураз
Горыч
нашае шчасце.

І душой неўпрыкмет
Заваподае ўладна
Разуменне, што свет
Часам злы, бесспагадны.

◈ ◈ ◈

Як прагну я ў жыцці прасвету,
Калі — бы вырвешся з глушы,
Калі гармонія сусвету
Адно
        з гармоніяй душы.

Ды ўсё радзей, радзей такое
Мне дорыць сумнае жыццё —
Бы прывучае да спакою,
Да пераходу ў небыццё.

◈ ◈ ◈

Прах дарагі зямля накрыла,
Стаю, бы скамянелы, я...
Гусцей сяброўскія магілы...
І блізіцца чарга мая.

Гады сплываюць, як паводка,
Жыцця вузеюць берагі,
І кожны новы дзень — знаходка,
Хоць шчасця поўны, хоць — тугі.

◈ ◈ ◈

Як баюся ўбачыць пустату
Там, куды душой імкнуся ўпотай,
Незнарок угледзець чарнату
Пад праменнай, зыркай пазалотай.

Лёс мой, лёс! Магчымасці не дай
Мне дайсці да гэткае ясноты —

Бачыць жыццярадаснасці край
І пачатак вечнае самоты!

◈ ◈ ◈

Адхацела сэрца, адхацела
Наўздагон за марамі імчаць.
Зморанаму цяжкасцямі целу
Не дагнаць ужо іх, не дагнаць.

Ім цяпер камандуе лянота,
А яна — нядобры камандзір…
О, жыццё! Гані з душы сумоту,
Усталюй у ёй спакой і мір!

◈ ◈ ◈

Не знімеш, быццам ношку, груз гадоў
І не перакладзеш камусь на плечы.
Адзін яго, самотны, будзь гатоў
Панесці неспадзеўна па-старэчы.

Цябе зыначаць доўгія гады,
Хаду, паставу, выгляд твой зыначаць…
Учора толькі быў я малады —
А сёння глянуў на сябе іначай.

◈ ◈ ◈

Ні зроку, ні зубоў, ні кучараў былых —
Мо засталася нейкая палова.
І столькі ж мар, надзей цяпер маіх…
І да далейшай згубы я гатовы.

Што шкадаваць аб гэтым! Хай ляціць жыццё,
Няўхільна робіць вечны свой рабунак!..
Мне тых шкада, хто адышоў у небыццё
І не паспеў падбіць такі рахунак.

◈ ◈ ◈

Што шкадаваць аб валасах,
Аб зроку і аб іншых стратах,
Калі душою я ачах,
Калі наступнае не ў святах.

Душа бы трапіла ў капкан,
Ужо ёй здрадзіла фартуна...
Хоць не відаць на беднай ран,
А ўсё ж патрэбен паратунак.

◈ ◈ ◈

Восень. Сонца ззяе без ахвоты.
Гаснуць летуценні. Давідна
Сны душу агортваюць самотай.
Восень. Да нябёсаў жаўцізна.

Восень. Ціха. Там і тут пустэчы.
Невясёласць навакол, імгла...
Быццам рыхтаваўся да сустрэчы —
Ды знянацку восень падышла.

◈ ◈ ◈

Мне лёс не дорыць святаў і прыўкрас,
Будзённасць жыць у горычы змушае...

І павадырка-Муза іншы раз
Мяне надоўга раптам пакідае.

І вось тады бярэ мяне туга,
Палоняць розум чорныя развагі,
І роспачы тады прыйсці ільга,
І жыць тады зусім няма адвагі.

◈ ◈ ◈

А як сягнуць да апагею
Бядоты цяжкаю парой,
Хто сцвердзіць нам, што мы не смеем
Пятлю занесці над сабой?

Хто лепш за нас узважыць гора,
Штурхне якое да пятлі?..
Душа мая, бушуй, як мора,
Тапі няшчасцяў караблі!

# IV

# МЕЛАНХАЛІЧНЫЯ ВЕРШЫ

◈ ◈ ◈

Жыццё — быццам мора.
Мы смела па хвалях
Вяслуем да зморы —
А што там, у далях?

У жорсткія штормы
Вяслуем адчайна.
Імкнёмся ў прастор мы
Па вечныя тайны.

◈ ◈ ◈

Я знаю, смерць такая пустата:
Дарога абарвецца пад табою,
І ўперадзе — ні сцежкі, ні куста,
Няма нябёсаў нат над галавою.

Уперадзе — нібы абрыў круты:
Ляціш — абвялі і душа, і цела...
Як лёгка стаць здабыткам пустаты.
Як цяжка ў доўгі век паверыць смела.

◈ ◈ ◈

Хтось тайны шэпча мне: «Жыві паволі.
Ну, колькі можаш подбегам ты жыць?»
Ды мне выпрабаванняў не даволі,
Мне з неспакоем суджана дружыць.

Дзён мітуслівых спазнаваць гарачку,
Высільвацца і выжываць ледзь-ледзь...
Душа мая! Ты не заляж у спячку,
Нібы ў бярлогу восенню мядзведзь!

◈ ◈ ◈

Не спыніць навокал шматгалосся —
Ці ў журбе страчаць нам Новы год!..
Хоць і шмат на лёс бяды прыйшлося,
Прагні, сэрца, як раней, прыгод!

Не лічы гадоў пражытых строга
І павер у доўгае жыццё...
Нечакана творчасці дарога
Абарвецца хай у небыццё!

◈ ◈ ◈

Дай ад спакою адцурацца,
Жыццё, і творчы дай уздым,
Зрабі няўрымслівасць багаццем
Галоўным назаўжды маім!

Прыцішвай ты мяне пад вечар,
Бадзёр, калі прагляне дзень...
Мне б вечарам — са стомай стрэча,
Мне б на світанку — маладзець!

Хто хоча, хай жыве ў спакоі,
У ціхай завадзі тваёй…
Мяне ж, бы ў мора штармавое,
Жыццё, штурхай у неспакой!

◈ ◈ ◈

Хоць і быў на краю магілы,
Хоць і выбраў смерць папрасцей —
Сябар даўні мой, сябар мілы,
Ты шукай мяне між людзей.

Ад нягод ледзь не збег да смерці…
Ты мяне, аднак, не шкадуй,
Бо цяпер загадай памерці —
Узмалюся: «Адтэрмінуй!»

◈ ◈ ◈

Жыць — дорага, памерці — не танней…
У лепшы свет няўхільным адыходам
Не абцяжарыць мару я дзяцей —
Заўжды непрадугледжаным расходам.

О, вечнай эканоміі цяжар,
О, жончыны заўсёдныя дакоры…
Не, лёсу я свайго не валадар,
Бы карабель, які штармуе ў моры.

◈ ◈ ◈

Караці, жыццё, кароткі век,
Нагрувашчвай груз гадоў на плечы…
Ды ўсё роўна — слабы чалавек —
Прагну я з нязведаным сустрэчы.

Што ты наканүеш мне, жыццё,
Заўтра чым узбагаціш свядомасць?..
Кожны дзень рабіць бы адкрыццё,
Крочыць кожны дзень у невядомасць!

◈ ◈ ◈

«Жэрабя кінута!..» — сэрца рашучасцю
Зноў перапоўнена, зноў.
Стрэцца гатова яно з немінучасцю
Цяжкіх жыццёвых шляхоў.

Радасцю мроіць яно выпадковаю —
Быць жа і ёй у жыцці…
«Жэрабя кінута!» — з гэтымі словамі
І на той свет адысці.

◈ ◈ ◈

Вунь як дуброву вецер шкуматае.
Трашчаць галіны і ляціць лісцё…
Так і ў маёй душы падчас бывае
Змярцвелых думак ломка і збыццё.

Няхай сабе аджытае, сухое
Знікае назаўжды ў сваю пару!..
Калі і я мо высахну душою,
Ну, дык няхай тады і я памру!

# V

# ВЕЧНЫ СВЕТ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

◈ ◈ ◈

Можа ўсё змяніцца сёння:
Быў ты панам, ды прапаў.
Моцна ты сядзеў на троне —
Раптам хісткім трон твой стаў.

Вечны свет пераўтварэнняў:
Ты — сюды, а лёс — туды...
То святкуеш мар здзяйсненне,
То марнееш ад нуды.

І ўсё ж вечнае жаданне —
Да вяршынь жыцця ісці...
Існаванне, існаванне,
Дай мне дужасць у жыцці!

◈ ◈ ◈

На пень бярозавы стары
Шпурнула жалудок віхура.
Сагрэў малога пень пануры —
Дубок прабіўся з-пад кары.

Даў чалавек другому кроў,
І дапамогі шчодрай грамы
Бадзёраць ніць кардыяграмы —
Чужое сэрца б’ецца зноў.

Чужая іншы раз радня
Бярэ на догляд свой калеку…
Назло бяздушнасці адвеку
Ты існуеш скрозь, дабрыня!

Няхай мяне чакаюць дні,
Калі нуда агорне грудзі —
Не пашкадую дабрыні
Я і тады вам, людзі!

◈ ◈ ◈

Вось і старт. Рванулі скакавыя.
Пыл курыцца і зямля дрыжыць…
Конь прыгожы з выгінастай шыяй,
Пастарайся, ўсіх перамажы!

Паляці, бо ты ці не крылаты,
З залатою грывай конь-агонь!..
За табою мчыцца таўставаты,
Вараны, зусім звычайны конь.

Ды з табой змагацца — ці не з ветрам…
Але што такое? Я ў журбе:
Вараны ваюе сантыметры,
Усё болей засціць ён цябе.

Хоць рвануў не першы ён са старту —
Паскарае ўвачавідкі скок…
Ах, які сапернік твой упарты!
Ах, як добра зроблены рывок!

Адстаеш ты, адстаеш, рысачка!..
Зух сядзіць на вараным кані!..

…Гонг. Адбой. Закончылася скачка.
Вось цяпер усё і ацані.

◈ ◈ ◈

Нож бульдозера звальвае грушу
І страсае пялёсткі суздром…
Недалёка рабочыя рушаць
Не стары, але нізенькі дом.

Аджыло. Адгуло. Зруйнавана.
Вось да неба ўзвышаецца гмах…
Пазначаюць пад'ёмныя краны
Генеральнага плана размах.

◈ ◈ ◈

Ад грымотаў куст не знаў спакою.
Вецер трос яго і лівень біў…
А пасля, вячэрняю парою,
Коцікамі жоўтымі расцвіў.

Цэлы дзень ішло за ліхам ліха
І гнялі паэта боль і зло…
А пад вечар песняй ціхай-ціхай
Сэрца нечакана расцвіло.

◈ ◈ ◈

З гадамі пакахаць усё цяжэй,
Хоць да жанчын не слабне прыцягненне,
Хоць мы з жыццём знітованы цясней,
Ды так бяднее нашае ўяўленне!

Усімі дабрачыннасцямі ўжо
Не надзяліць душы сваёй абранне,
Ды мучымся ўсё ж думкаю: няўжо
Да скону не азорыць нас каханне?

◈ ◈ ◈

Старэйшы брат на выгляд не старэй.
І гэта — бы насуперак прыродзе,
Бо аж на пяць гадоў на свет пазней
З'явіўся меншы — ў сорак першым годзе.

Ды не ставала немаўлю яды
І малака ў матулі не хапала —
І бы зраўняла братавы гады
Фашысцкая навала.

◈ ◈ ◈

Дом зносяць, крышаць — і з усіх бакоў
Ляцяць абломкі, як пад ветрам лісце…
Жылі тут людзі, пэўна, шмат гадоў,
Ды час усіх перасяліў кудысьці.

О, гэты ўладны, ўсемагутны час!
З дня нараджэння селіць у калыску,
З маленства ў сталасць пасяляе нас,
Пасля дае і ў старасці прапіску.

І ўрэшце рэшт ён пасяляе ўсіх
У самыя няўтульныя кватэры…
А я — бывае гэткі дзіўны міг —
Яшчэ, як хлопчык, у бяссмерце веру.

◈ ◈ ◈

Змывае вечнасць пакаленні,
Бы камяні — марскі прыбой...
Ад маладосці да сталення
Прайшлі так хутка мы з табой.

Вякам што смерць, што існаванне —
Бы хвалі, коцяцца яны...
Дзе, сябар, нашы парыванні,
Дзе нашай маладосці сны!?

◈ ◈ ◈

Пралятаці гады, не сачыў я за імі зусім.
Быў я сам малады і было ўсё вакол маладым.

З кожнай новай вясной пачынаўся забаў карагод.
Абнаўляўся душой я пад ласкавым сонцам штогод.

Ды іначыцца лёс, незаўважна ён гора нясе...
Я губляю сяброў, я старэю, на жаль, пакрысе.

Парадзела радня, зарастае бацькоўскі гарод,
Дзеці — клопат штодня, і ў натхненні заўжды
недарод.

Сум за грудзі бярэ, не засвеціцца сонцам пагляд.
Хоць і май на двары, а ў душы лістапад, лістапад...

## ПАДМАННЫ НАДПІС

> У гэтай хаце жыве ўдзельнік Вялікай
> Айчыннай вайны.
> *Надпіс на сцяне*

Апусцела хата, двор маўклівы.
Зарастае пустазеллем сад.
Чырванеюць яблыкі і слівы,
Ды ніхто іх чырвані не рад.

Пашарэлі пад страхою дровы,
Заржавеў у закутку тапор.
Не мычыць каля хлява карова,
І сабака не пільнуе двор.

Небыццём усё апанавана,
І гарод скрозь паланіў палын...
І на сэрца давіць цяжкім зманам
Дошчачка — журботны напамін.

◈ ◈ ◈

Прысады гожа голле гнулі,
Таму ўзяла адразу злосць,
Як толькі ўгледзеў я бабулю,
Што секла гэту прыгажосць.

Ды, апярэджваючы ўпікі,
Кабета глянула ва ўпор:
«Што, сынку, грэх раблю вялікі?
Ды дроў няма — стары памёр...

У лесе дрэвам ці ж дам рады,
Ды ці ж прынесці мне самой?..»

І ў сорам кінула тырады,
Што я хацеў сказаць старой.

## ПРА ДЗЕДА І ЎНУКА

Выйшлі з трамвая яны ля базару,
Кошык застаўся ля месца майго.
Можа, не іх? Ды і што гэта — тара.
Крыкнуць бы... Позна... Ат, гора таго!

Трохі праехаў трамвай — заўважаю
Клопат старога спыняе, і ён
Сумна сівой галавою хістае —
Не пабяжыш за кашом наўздагон.

Я ж разважаю: ну, што тут такога —
Кошык пусты і пусты ў ім мяшок...
Стала, аднак, невясёлай дарога —
Сэрца адчула сумлення папрок.

◈ ◈ ◈

*М. А.*

Ты зведала пакут задужа
І дома, і ў чужой зямлі.
І п'янства сына, п'янства мужа
Заўжды найгоршымі былі.

Бальніца — страшная прынука...
Хоць дома вінны дух цяжкі —
Лягчэй з хваробаю ля ўнукаў,
Ля зяця і каля дачкі.

Ды толькі смерці не абдурыш,
Не спадцішка прыйшла яна...
І вось ужо зямлёю бурай
Твая закідана труна.

І ўжо нічога не зыначыць,
Усё — у прах, у немату...
О, час! Ты не даеш аддзячыць —
Ляціш! — людзям за дабрату.

## ТЫМ, КАГО ПЕРАНОСЯЦЬ ЗА ГОРАД

Не далі належацца ў доле,
Пачынаюць выкопваць вас...
Тут не будзе могілак болей,
Сквер тут зробіць паспешны час.

Там няўтульна будзе ці мулка —
Не паскардзіцеся ані...
Разам з вамі страціць завулак
Мо гектар, мо больш цішыні.

VI

# ШТРЫХІ ДА ШТРЫХА

## ЗГАДКА ПРА М. БАГДАНОВІЧА

«Багдановіч, зірніце! Венера ўзышла...» —
Голас-мроя каханай.
Рана вочы яму засцілае імгла.
Памірае ён рана.

О, праклятая смерць. Не бяры, не бяры!
Дай упіцца каханнем!..
Памірае паэт майскім днём на зары
Са святым парываннем.

А за вокнамі мора лагодны блакіт
Лёг ад краю да краю...
Верыць ён, што зусім не адыдзе ў нябыт —
Беларусь прыгадае.

## СУСТРЭЧА Ў АЎТОБУСЕ

Вёсак, дрэў мільганне,
Рэдкія прыпынкі.
Смех і шчабятанне
Мілае дзяўчынкі.

Цуд светлагаловы,
Шчырасць у паглядзе,

Радасныя словы:
«Ты прыгожы, дзядзя!»

Сэрца ў замяшанні
(Вось дык сказанула!) —
Гэткае прызнанне
Першы раз пачула.

◈ ◈ ◈

Спраўна выйшла! Ці ж я не вясковы —
Да пілы прывык, да тапара...
Матчын дом стаіць, як быццам новы.
З вуліцы любуйся і з двара.

Што зрабіў шалёўкаю я з хатай!
Гожа ўзор віецца па сцяне...
Радасць працы — за старанне плата.
Іншай платы і не трэба мне.

◈ ◈ ◈

Рукамі ўзмахваючы, плаўна
Я набіраю вышыню...
І мне няўцям, што гэта сню,
Што не наяве сэрцу слаўна.

Калі ж ад казачнага стану
Абудзіць досвітак мяне —
Здаецца нейкі момант мне,
Што палячу, калі і ўстану.

◈ ◈ ◈

Хлапчук з павелічальным шклом,
Ты, паркавай травой схаваны,
Заняты мушкай ці жучком,
Сабе здаешся веліканам.

Шчаслівы ты, а я бядак:
Мне тэлескопам быў адкрыты
І Млечны шлях, і Задыяк —
І стаў я карлікам нібыта.

◈ ◈ ◈

Ізноў шчаслівае імгненне
З пагодай добраю прыйшло.
Якое зручнае сядзенне —
Веласіпеднае сядло!

Віраць імклівыя педалі...
І не спыняе ветру шчыт...
За кожнай горкай — далі, далі,
Жыцця далёкі краявід.

## ЛЫЖНАЯ ПРАГУЛКА

*В. А.*

Мароз які! А снег які!
Якое наваколле!
І мы з табою напрасткі
Бяжым праз наша поле.

Які разгон! Які шарон!
Зіхціць вакол улонне...

Звон пад нагамі, ў небе звон,
І сэрцы нашы ў звоне.

◈ ◈ ◈

*В. А.*

Ты навошта выкінула коцікаў —
Шэранькіх пушыстых камячкоў?..
Хто цяпер да іх маленькіх роцікаў
Паднясе ў бляшанцы малако?

Да каго цяпер яны прытуляцца?..
Бачыш, колькі часу я ў журбе?
Выкінула з імі ты на вуліцу
І маю пяшчоту да цябе.

## НА ЛІТАБ'ЯДНАННІ

Чытанне з пыхай маладою,
З упэўненасцю паказной —
Юнак натхнёны сам сабою,
Юнак здаволены сабой.

А я здаволенасці гэткай
І ў сталасці не валадар...
Паэзія! Ты толькі сведка
Маіх пачуццяў ці мой дар?

◈ ◈ ◈

Я мора бачыў. Мне яно
Не нашаптала летуценні.

Наадварот — гуло, ажно
На бераг кідала каменне.

Узбунтавала даль сваю
За гарызонт перада мною,
Разбушаванаю красою
Маркоту сцішвала маю.

◈ ◈ ◈

Як яе не пашкадуеш,
То бяда з бядот:
Пахавалі маладую —
У семнаццаць год.

Як прайсціся ёй карцела!..
Ці ж яе віна —
Ногі не трымалі цела,
Падала яна.

І бяссільнай медыцына
Для яе была…
Чэзла бедная дзяўчына,
Лежачы жыла.

Ні самой сабе загады
(І яны былі),
Ні бацькоўская спагада
Не дапамаглі.

Задушэўны голас мілы
Помню я здаўна…
Чым табе не дагадзіла,
О жыццё, яна?!

## ЛІНАТЫП*

Як быццам рукі чалавечыя,
Былі яго суставы гнуткія —
І выпякала, быццам печыва,
Машына літары бялюткія.
Яна ніколі не стамлялася,
Была заўжды на працу здатная...
І бачна ўсім было: натхнялася
Машына творамі выдатнымі.

## СВЯТАЯ ПРАСТАТА

Памерла бабуля — і зноўку, і зноўку
Так плакаў па ёй мой маленькі сынок...
Рыдаў... Ды, наіўны, узяў быў рыдлёўку —
Каб сыпаць на бабіну ў доле дамоўку
З дарослымі разам іржавы пясок.
Так там, дзе магіл панаванне кругом,
Уладу жыццё праявіла над тлом.

## ТКАЧЫХА

### Песня

Неспакойна ручанькам белым ля станкоў
Ад заўжды імклівага лёту чаўнакоў.

То аснова зблытана, то прапаў уток,
І чакае дзеўчыну спынены станок.

---

* Так называлася друкарская машына, якая выпякала літары з разагрэтага свінцу.

І яна спяшаецца, і ад спрыту рук
Хутка аднаўляецца чаўнаковы стук.

Вунь як завіхаюцца, б'юць, як малаткі,
Лётаюць маланкамі дзіва-чаўнакі!

Нітачка да нітачкі — тчэцца палатно,
Дзеўчына ўсміхаецца — добрае яно.

## ПЕСНЯ ШТАНГІСТАЎ

У нас характар малады,
Стаць сілачамі ёсць прычыны...
Са штангай дружаць заўсягды
Адно жалезныя мужчыны.

*Прыпеў*:

Любіце рынг, любіце корт,
Любіце велічнасць футбола...
А нам давай жалезны спорт,
Давай нам штангі звон вясёлы!

З вялікай справіцца вагой —
Заўжды задача ў нас такая...
І дружыць штанга з вышынёй,
І да рэкордаў узлятае.

Упартыя, без лішніх слоў,
Мы пасылаем штангу ўгору,
І наша ўпартасць зноў і зноў
Перамагае нашу змору.

Мы спіну і ў жыцці не гнём,
Мы людзі ўпартае пароды.

Мы цвёрда па жыцці ідзём,
І нам не страшныя нягоды.

## У АДНЫМ ІНТЭРНАЦЕ

Прыйшлі вясёлыя да іх —
Было прыветным запрашэнне...
Спаілі. Згвалцілі. Дваіх.
Там не магло быць выключэнняў.
Там не знайшлося ні душы,
Якую б згідзіла такое...
Вясёлы смех у тым пакоі
Дзявочы ціхі плач глушыў,
Дзявочыя пустошыў мроі...
...І ў брудзе ёсць свае героі.

## НЕАДЧЭПНЫЯ ДУМКІ

Як мангуста стрэсвае з сябе ў час бойкі змяю,
Так я неадчэпныя думкі стрэсваю...
Ды яны ў рэшце рэшт аблытваюць мяне,
Ды яны ў рэшце рэшт зморваюць мяне,
І я, канчаткова знясілены, кідаюся апоўначы ў сон,
бы ў прадонне.

◈ ◈ ◈

Прачнуўшыся апоўначы,
Не магу ўспомніць,
Для чаго пачынаўся пражыты дзень...
І мне страшна,
Што калі-небудзь
Задумаюся аб тым,

Для чаго разгаралася маё жыццё,
І не знайду на гэта адказу.

## ЖОНЦЫ

Аб сыне і дачцэ
Твой клопат кожны міг,
Душа твая баліць,
Ты знервавана…
Што ж мне рабіць?
Душу маю за ўсіх
Дзяцей зямлі,
Галодных і худых,
Вярэдзіць клопат
Незагойнай ранай.

◈ ◈ ◈

Вечныя жончыны ўпікі,
П'янства радні за сцяной…
Смутак мой, смутак вялікі,
Як развязацца з табой?

Моцна ты сэрца аблытаў,
Беднае гэтак баліць —
Душыш і душыш… Нібыта
Хочаш зусім задушыць.

◈ ◈ ◈

Не ўсё прыгожа і трывала,
О, сябар даўні, у мяне,
І, што жыццё наканавала,
Таго мой лёс не абміне.

Усю карціну дабрабыту,
Знай, маляваў мой аптымізм...
А ў гэты час уладна, скрыта
За полы торгаў песімізм.

## ВЕТЭРАНАМ У ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

Маці ад вайны мяне хавала,
Пушчы ратавалі ад навалы.

Ды мяне напэўна б не мінулі
Мне вайной прызначаныя кулі.

Быў бы смерцю я напэўна ўзяты,
Каб не вы, савецкія салдаты.

Гэта вашы ўмельства і геройства
Не далі пабольшыцца забойствам.

Гэта вашы мукі і трывогі
Прывялі да свята Перамогі.

Ззяе хай на вашым слаўным сваце
Медалёў і ордэнаў багацце!

Хай звіняць непераможным звонам
Вашы ўзнагароды для мільёнаў!

## СЛЕПАТА

Абставіны ў адну чаргу мяне
Паставілі з жанчынай гаваркою,
Празмерна ўважлівай да сына год пад дзесяць.
Яны стаялі за маёй спіной.

А сцэна адбывалася ў сталоўцы.
— Сыночак, ручкі не забрудзь!
Не стукні аб сцяну сваю галоўку!..
А есці што ты будзеш, коцік, ну скажы!
Давай з'ядзім капустку, супчык, рыбку…
І так — пакуль нас не паклікалі за стол.
А за сталом хлапчук палез па хлеб
І незнарок рассыпаў па абрусе,
Пачаў кавалкі складваць зноў у стос
(Заўваг жанчына хлопцу не рабіла,
У гэты час ішла гаворка ў іх
На нейкую зусім другую тэму.)
Прынеслі стравы. Хлопец сёрбаць стаў —
Чутно было, напэўна, на паўзалы —
І браць кавалкі хлеба, ды не тыя,
Што ён з абруса падбіраў нядаўна…
Жанчына ўсё пыталася:
— Ну, смачна?
Мо горача? Мо недасол?
Спяшалася падцерці губы сыну
Сурвэткай, што ляжала на стале…
А сёрбання яго не заўважала
І чаўкання, калі ён ухапіўся за біфштэкс.
О, слепата людская! Побач з ёй
Сябе мы адчуваем так няёмка
І, ўражаныя ёй да анямення,
Не ведаем, што трэба нам рабіць.

◇ ◇ ◇

Лячу на лёгкакрылым АНе,
Ды я ў ім — лішні чалавек,
Таму мяне на чамадане
Трымае грузавы адсек.

Тут цесна, мулка, столь тут нізка,
І без суседзяў, без людзей
Здаецца бездань надта блізкай —
І страх не выдыхнуць з грудзей.

◈ ◈ ◈

А як бы маці паглядзела,
А бацька як бы ацаніў?..
Сумленнем іх змярай парыў —
Тады ў задумах будзеш смелы.

А як бы людзі ацанілі,
А што народ сказаў бы твой,
Калі б не жыў ты барацьбой,
А ўсё адседжваўся б у тыле?

## КРАДЗЕЖ ВЕЛАСІПЕДА

«Куды глядзеў ён? Ну і разявака!
Не ўмее, бачыш, пільнаваць як след...»
Зацюканы стаяў я, небарака,
Знік, быццам прывід, мой веласіпед.

І злодзеем раптоўна абабраны,
І непрыяззю ўдараны людской,
Стаяў я, дзве бы атрымаўшы раны...
Для роспачы хапала і адной.

◈ ◈ ◈

У роздуме, вясне і сонцу рад,
Іду між кветак сонечным бульварам,

Але наперад кінуты пагляд
Перапыняе думак плынь і мары.

Між прыгажосці — брыдкасці сляды:
Не трапіць бы ў плявок які нагою...
О, як вам цяжка, цнотныя кветы,
Схіляцца гэтак нізка над брыдою!

◈ ◈ ◈

Па дарозе коціцца раўчук,
Б'ецца аб ільдзістыя парогі...
За сваім караблікам хлапчук
Мчыцца напярэймы ўздоўж дарогі.

Не паспеў, хоць шпарка мчаўся ён, —
Той нырнуў у цёмны вір з адхону...
Плача хлопчык, бо яго разгон
Не раўня вясенніх вод разгону.

## ТРАМВАЙНАЕ КАЛЬЦО

Адсюль раскручваюся я —
І не злічыць усе турботы —
Нашуся па кругах быццця
Ад панядзелка да суботы.

## НА ШАРАЙ ГАДЗІНЕ

Калі па вулцы ішоў забытай,
То хтось адхінуў фіранку,
Мяне пазнаўшы нібыта,
Па хаце пабег да ганку.

На ганак выбег у белым
І раптам стаў бы над кручай —
Як я, ў парыве нясмелы,
Як я, ва ўсім нерашучы.

◈ ◈ ◈

Мутнее розум чалавечы,
Калі падумаеш аб тым,
Што ўсё ж заканчваецца нечым
Светабудовы цьмяны дым.

А чым? Святлом ці чарнатою?
Адказ не з'явіцца здаля…
О, думкі! Роспачныя мроі!
Уціхамірвай іх, Зямля!

## ВЫМУШАНАЕ ЗНАХОДЖАННЕ НА ПОЎДНІ

### 1

Тут, у паўднёвай старане,
Садавіной, цяплом прынаднай,
І мора пошум не па мне,
І сонца бляск, і звон цыкадны.
Не даспадобы душны рай,
Дажджу працяглае чаканне…
Мне бераг рэчкі падавай,
Касцёр дзе-небудзь на паляне,
Будан у засені бяроз,
Вакол кастра вячэрні морак —
Усё, што ў сэрцы я прывёз
На незнаёмы бераг мора.

**2**

Штодзень салюся ў цёплым моры.
Яно гарэзнасцю сваёй
Шпурляе ўніз, штурхае ўгору
Матрац, надзьмуты духатой.
І я плыву на ім далёка,
Туды, дзе хвалі ў рост сасны…
Ды як ні ўзношуся высока —
Не бачу роднай стараны.

**3**

І з поўднем мне не замірыцца…
Ён сцішыў клопаты мае
І цела трохі лечыць быццам,
Але натхнення не дае.

◈ ◈ ◈

*В. А.*

Ноч і лес на цэлым свеце.
Месяц. Прыцемак ствалоў…
Спяць, бы ў ложку, нашы дзеці
На сядзенні «Жыгулёў».

І няма канца дарозе,
Паласа святла ад фар…
Цела ў слодычнай знямозе,
Ціхата ў душы ад мар.

◈ ◈ ◈

Так многа злых было спрадвеку,
Але не будзь і ты такі —
Рабі дабро для чалавека,
Глядзі ў наступныя вякі.
Няма там месца злосці лютай,
Стаў чалавекам чалавек,
Злосць у кантэйнеры закута
І ў моры ўтоплена навек.

## ЛЯ МЕМАРЫЯЛУ «КАНЦЛАГЕР ТРАСЦЯНЕЦ»

*Памяці Генадзя Кляўко*

«Уезд забаронены!» — знак.
Да мемарыялу дарога...
Ды на матацыкле аднак
З дзяўчынай імчыцца юнак —
І сцішак успорвае... рогат.

Нямеем. Няёмка не ім,
А нам, што пабачылі гора...
Не ведаем, што маладым
У месцы, ад болю святым,
Сказаць, калі зноў загаворым.

## «КУПІЦЕ ДЗЯЎЧЫНКУ»

У Рыме, у цэнтры, на плыні жыцця
Жанчына крычыць без упынку:
«Купіце, сіньёры! Купіце дзіця!
Купіце дзяўчынку!»

Хапае прахожых за рукі яна,
А тыя ў вялікім здзіўленні:
Хто гыркае злосна: «Ідзі, сатана!»,
Хто дробязь вымае з кішэні.

А дзеўчынка ўткнулася ў матчын жывот
І роспачна-роспачна плача…
І міма цячэ, працякае народ.
Ці ж будзе кабеціне ўдача?

У Рыме, у цэнтры, на плыні жыцця
Жанчына крычыць без упынку:
«Купіце, сіньёры! Купіце дзіця!
Купіце дзяўчынку!»

◈ ◈ ◈

Мне ў лета бабіна самотна,
Я станаўлюся сам не свой.
І я туды іду ахвотна,
Дзе скрозь крыжы і супакой,
Дзе ўсё і ўсе са мною згодны,
Што б моўчкі ні сказаў ці ўслых…
І вее нечым надта родным
Ад помнікаў і ад крыжоў усіх.

◈ ◈ ◈

Моўных я не люблю выкрутасаў,
Не люблю карабачаных слоў.
Уладараць душою Някрасаў
І варонежскі прасал* Кальцоў.

---

* Прасал — у XIX ст. гандляр жывёлай.

Не люблю я звышмодных паэтаў,
Што палююць на вычварнасць фраз...
Кане ўсё... Будзеш вечнай адметай
Ты, Шэкспіра і Пушкіна сказ!

◈ ◈ ◈

Высноў пляткарскіх крыгі,
Каварных чутак звон...
О, вечныя інтрыгі,
Пляткарства злы палон!

Як аддаваць ні будзеш
Дабру душу сваю —
Пахрысцяць брудам людзі
І дабрыню тваю.

◈ ◈ ◈

На свеце тысячы дарог,
Кіруюць іншыя да п'янства...
Чаму ж, чаму ж прыводзіць Бог
Людзей да самаашуканства?

Ці ў гэтым не яго віна,
А людзі самі недарэкі —
Не бачаць, што цяклі б з віна,
Калі з пасуды выліць, рэкі?

# VII

# НЕ ЗАКАХАЦЦА ХІБА ЛЬГА?

## ЖУРАВІНЫ

На балоце раным-рана
Мар'я брала журавіны.
І здалося ёй, што глянуў
Раптам нехта з-за яліны.

Мар'я зразу ледзь не ўмлела,
Ледзь не крыкнула знячэўку,
Знемаглася, пабялела...
Хто ж спалохаў гэтак дзеўку?

Хто прыйшоў за Мар'яй следам,
Прасачыў неспадзявана?
Дзеўка ўгледзела суседа —
Прыставальшчыка Івана.

Вось ён выйшаў з-за яліны,
Прыставаць ізноў ахвочы —
Паляцелі журавіны
Разам з кошыкам у вочы.

Ды рукою кош адбіты,
І бліжэй ідзе хлапчына...
Дык чаму стаіць адкрыта,
Прэч не кінецца дзяўчына?

Уцячы не мае сілы —
Хто ўцякае ад кахання?
Прыставальшчык, хлопец мілы,
Рады дзёрзкаму спатканню.

Ён з усмешкаю харошай
Падступае да дзяўчыны…
Паляжыць парожнім кошык.
Пачакаюць журавіны…

## ПРЫНАМСЯ

Хтосьці ёй сказаў: «Прыгожая ты стала!..»
«Сімпатычная, прынамсі!» — адказала.

І па вёсцы паляцела пагалоссе:
«Сімпатычная Прынамся наша Зося».

І вось чуецца і ўвечары, і ўранні:
«Сімпатычная Прынамся, прывітанне!»

Ды за словам у кішэнь не лезе дзеўка,
Адгукаецца вясёлаю прыпеўкай:

«Хай сабе не прыгажуня, а Прынамся,
Ды абы-каму, дзяўчыначка, не дамся».

Ды і як ёй устрымацца ад спявання —
Спадабалася каханаму празванне.

Ён Прынамсячкаю Зосю называе,
Калі ўвечары да сэрца прытуляе.

І Прынамсяччыны ціха шэпчуць губы:
«Пацалуй сваю Прынамсячку, мой любы!»

## СПАТКАННЕ

Дзе да лесу падыходзіць абалона —
Красак розных, красак пекных незлічона.

І хаваецца між красак азярына...
Як любіў туды заглядваць я, хлапчына.

Неяк раз прыйшоў туды я на рыбалку
І заўважыў на сярэдзіне русалку.

Ціха-ціха азярына булькацела
І свіцілася дзявочым белым целам.

Я ж папаўся, недарэка, як у нерат:
Ні назад было падацца мне, ні ўперад.

І збянтэжыўся зусім, міжвольны сведка,
Як убачыў, што з вады ідзе суседка.

І глядзеў я, бы ўкапаны, ва ўсе вочы
І на грудзі, і на стан яе дзявочы.

Ды падацца ўміг заставіла ў квяты
Палахлівае, дзявочае: «Ах! Ты?»

Эх, юнацтва — нечаканае спатканне!
Эх, юнацтва — незабыўнае каханне!

◇ ◇ ◇

І я малады, і яна маладая,
Няма і паўсотні нам разам гадоў...
І рэчка для нас, і трава лугавая,
І ясная поўня, і спеў салаўёў.

Кусты — як стагі, распушыліся вокал,
І лес павявае на нас цеплынёй…
І вусны так блізка, і ранне далёка,
І шчасце не вымераць ночкай адной.

◈ ◈ ◈

Месячна. Мроіўна. Песенна.
Выйшаў дзяркач у дазор.
Сэрца каханнем узнесена
Да паднябесся, да зор.

Крочым чароўнаю сцежкаю.
Ціша. Туман. Зарапад…
Свеціцца цёплай усмешкаю
Любай пагляд.

◈ ◈ ◈

Дзяўчыне прыкрае пасланне,
Як той Анегін, слаў і я:
Маўляў, маё да вас каханне —
Не больш як прыхамаць мая.

Не разумеў, што слаў пакуты —
Бы на душу ёй наступаў…
І да таго навек прыкуты,
Як да ганебнага слупа.

◈ ◈ ◈

Чароўнай дзяўчыны ашука,
Маленькая хітрасць яе —
І прэч уцякае дакука,
Што блытала думкі твае.

Чароўнай дзяўчыны гуллівасць,
Гарэзны яе неспакой —
І ўжо заўладала цнатлівасць
Душою тваёй.

◈ ◈ ◈

Дзяўчына мо і не святая,
Ды столькі хараства ў яе:
Падыме вейкі — дык світае,
Апусціць — вечар настае.

Калі гаворыць — дык чаруе,
Калі маўчыць — бярэ туга...
Няхай сабе і не ў святую,
Не закахацца хіба льга?

◈ ◈ ◈

Не любы вы, не любы, —
Шапчу сабе загад, —
Пажадлівыя губы,
Пажадлівы пагляд!

Ды толькі дзень згасае
І моўкне даль палёў —
Яна ізноў святая,
І я бязвольны зноў.

І чым гусцей змярканне —
Мацней спляценне рук,
І думак хваляванне,
І сэрцаў перастук.

Ой, прывядуць да згубы
(Што той сабе загад!)
Пажадлівыя губы,
Пажадлівы пагляд.

◈ ◈ ◈

Да цябе, да тонкай чарацінкі,
Я ледзь-ледзь прабіўся праз натоўп…
Гойдаюцца чорныя хусцінкі,
Узлятаюць пальцы да ілбоў.

Гучны бас ляціць у храм з амбону,
Дзяк да столі дыму накадзіў…
Новы час даў волю забабонам
І цябе да Бога заманіў.

Год разлукі — быццам бы імгненне,
Ды цябе паспелі ўвесці ў зман
Гэтыя малітвы, песнапенні,
Саладжавы ладану дурман.

Як жа вырваць мне цябе з палону,
Вызваліць ад Бога і царквы?..
Гучны бас ляціць у храм з амбону,
Не выходзіць клопат з галавы.

Нудны спеў харысты зацягнулі…
«Дай руку!» — скажу вось-вось табе…
Павяду скрозь злосны шэпт бабулек
Да надзей, да мар сваіх цябе.

◈ ◈ ◈

Навек я дотык твой запомніў,
Цяпло пяшчотнае рукі,
І гаю ціш, і блізкасць поўні,
І голас твой, і шэпт ракі,
І ледзь прыжмураныя вочы...
Бы праз магічнае акно
Імгненне тае светлай ночы
Мне з глыбіні жыцця відно.

◈ ◈ ◈

Быў злы калісьці я на ўсіх людзей —
Здаваўся свет недабрачынным дужа...
Ды расцвіло каханне ў сэрцы ружай —
Мой свеце, я сказаў, ты дабрадзей.

◈ ◈ ◈

Ці гэта вечар натуманіў
Ці, можа, салавей напеў...
Маленькі домік. Поўні ззянне.
І ветру бэзавы павеў.

І сэрцаў стук. І рук спляценне.
І гарадка начны спакой.
І блізкай рэчкі мільгаценне.
І ўсё — заспетае зарой.

## МАРЫЯ

### 1

Не знала ты, што ўжо табе
Світанне вочы не раскрые...
Што ў вечнай будзеш ты журбе
Перада мной ляжаць, Марыя.

Не абудзіў ні дотык рук,
Ні крык душы, ні цалаванне...
За вечны боль душы
без мук
Бог дараваў табе кананне.

### 2

Бачу: нявестай прыбраная,
Бога ты ўжо нарачоная,
Гэткая вечна жаданая,
Раптам зусім незнаёмая.

Бачу: ляжыш ты, нявінная,
Вечным маўчаннем спавітая,
Побач з тваёй дамавінаю —
Гора маё непрыкрытае.

### 3

Яшчэ валошкі ў нашым полі
Цвітуць нябесным хараством,
Ды мы з табой ужо ніколі
Блакітных кветак не збяром.

Сабралі мы свае букеты
(А іх у нас няшмат было)...
Раптоўна скончылася лета,
Каханнем нашым адцвіло.

**4**

Губляе фарбы восень пакрысе,
Вунь колькі іх абсыпалася долу...
Я радасці згубіў з табой усе,
Хаця кастрычнік лье святло наўкола.

Ды ўжо няма ў душы маёй святла,
Яго забрала ты далёка дужа...
І хоць яшчэ ўсё млее ад цяпла —
Няшчадна сэрца абвявае сцюжа.

**5**

Вясна між дрэў прасветы занавесіць
Разгалістым кустоўем і лісцём,
І зноў утульна стане ў нашым лесе,
Ды мы з табой пад шаты не прыйдзём.

Ад смутку мне не прычакаць збавення
І не знайсці нідзе тваіх слядоў...
І дуб вунь наш стаіць у задуменні —
Як быццам і яго мой сум прыгнёў.

◈ ◈ ◈

Ёсць нешта боскае на твары,
Ва ўсім аблічча вабнасць ёсць...
Жыла ў душы заўсёды мара
Вось пра такую прыгажосць.

Гляджу я, ўражаны, з трамвая
І цямлю быццам бы праз сон:
Не шкло нас з ёю раздзяляе,
А бесспагадлівы мой кон.

І хоць яна глядзіць з даверам,
Даводжу я сабе, аднак:
Ну, хіба выскачыш за дзверы
І загаворыш проста так?

Не для мяне ты, чараўніца,
Не для мяне... Бывай, бывай...
Ужо знаёмству не адбыцца —
У вечнасць коціцца трамвай.

◈ ◈ ◈

Песні раздаюцца на гасцінцы
І вясною пахне мурава...
Ты ж адна застыла на бабінцы —
Бы цябе не прыняла царква.

Нешта вырашаеш ты цяжкое,
Моршчыць одум юнае чало...
Месяц загарэўся над царквою,
Песні не змаўкаюць за сялом.

Слухаеш ты спевы маладосці
І не ведаеш, куды пайсці...
Быццам бы ў жыцці згубіла штосьці
І не знаеш, як яго знайсці.

◈ ◈ ◈

Туман топіць лугавіну,
Ветах-месячык замёр…
Хлопец клікае дзяўчыну:
«Выйдзі, любая, у двор!..»

І дзяўчыну без прынукі
Ён да лавачкі павёў…
І адны навокал гукі:
Пацалункаў, ціхіх слоў.

◈ ◈ ◈

Пелі дзяўчаты: «Ой, рэчанька, рэчанька!..»
Выйшла нам з любай у вечар той стрэчанька.

Востра чаромхаю пахла ваколіца,
Пеў і не мог салавейка здаволіцца.

Доўга хадзілі мы ў вечар той з любаю,
Сэрцы згаджаліся з вечнаю згубаю.

Трэці ўварваўся у лёс наш віхураю,
Трэцім было наша шчасце разбурана.

Водар не нашай чаромхі разбродзіўся,
Спевам не наш салавейка заходзіўся.

Пелі дзяўчаты: «Ой, рэчанька, рэчанька!..»
Выйшла з каханаю сумная стрэчанька.

## ЗІМНЯЯ ЭЛЕГІЯ

Вокал бязлюддзе. Сярэдзіна дня.
Ціха мною кладзецца лыжня.

Горад паблізу, ды лыжны свой крок
Нешта ніхто не кіруе ў мой бок.

Можа, шчасліві́цца ў горадзе ўсім,
Скруха мо толькі на сэрцы маім?

Тоне ў задумнай смузе небакрай,
Песню сінічую дорыць мне гай.

Толькі не ўсцешвае срэбны матыў —
Веру я ў лепшага сябра згубіў.

Горасна вісне на ўзлеску галлё.
Веру згубіў я ў каханне сваё...

Вокал бязлюддзе. Сярэдзіна дня.
Сумна кладзецца за мною лыжня.

VIII

# ШЛЯХ АД ВОСЕНІ ДА ВЯСНЫ

◈ ◈ ◈

Мятуць навокал тратуары —
Пажоўклы ліст апаў на дол.
Ужо не воблакі, а хмары
Вісяць над горадам вакол.

Наблізіўся да скону жнівень,
На дрэвах — охра і іржа...
І не пальe вясёлы лівень —
Павісне прыкрая імжа.

◈ ◈ ◈

Апануранны, скалелы,
У зняменні ледзяным
Гай стаіць яшчэ не белы,
Ды счарнелы ўжо зусім.

Так і ты, душа паэта,
Не жывеш напагатоў:
Адляцела радасць лета,
Сум зімовы не прыйшоў.

◈ ◈ ◈

Туманы абдымаюць прысады,
Кропяць кожную зморшчку кары.
Вылятаюць, як быццам з засады,
З-за кустоў нечакана вятры.

Я прымаю цябе, непагода,
Кожны твой, лістападзе, парыў,
Бо жыве яшчэ ў сэрцы лагода,
Што чароўны кастрычнік дарыў.

◈ ◈ ◈

Адгрымелі восені калёсы,
Выліліся сонныя дажджы,
Лісця пашарэлага наносы
Грудамі ляжалі, як лаўжы.

Напаўнялі сэрца сумным станам
Восеньская шэрасць, галізна...
Ноччу ж выпаў снег... І быццам зманам
Легла ў наваколлі белізна.

◈ ◈ ◈

Вакол парошы белізна,
Але прырода ў задуменні:
Папрыгажэлая, яна
Як бы не рада абнаўленню.

◈ ◈ ◈

Як разлінееныя разлогі:
Тут — сцежка ўеццa, там — лыжня!..
Ужо мароз не надта строгі
На золку лютаўскага дня.

Ужо і снег не надта белы —
Блакіт нябёс у ім асеў
І штосьці ў лесе зазвінела…
То ці ж не берасцянкі спеў?

◈ ◈ ◈

Яшчэ паўсюль гуляе смела,
Снег назапашвае зіма,
Аднак ужо адчула цела,
Што ў ёй суровасці няма.

Ледзь адчувальная лагода
Выходзіць з глыбіні снягоў…
Бы падмарылася прырода
І адпачыць ёй час прыйшоў.

◈ ◈ ◈

Зусім ужо не надзьмуты
(Напэўна ж перад вясной)
Святлее аблічам люты,
Прыгледзьцеся, раніцой.

А сёння ранак — як росны
І цёплы капеж са стрэх…
Памыў хтосьці ноччу сосны,
Зрашэціў пырскамі снег.

◈ ◈ ◈

Прымарозіў светлы вечарок
Белыя падталыя раўніны,
Толькі ціха ценькае цурок —
Рэха апаўдзённай ручаіны.

Перад холадам начным вясна
Нітку не парвала вадзяную.
Заўтра сонца ўгрэе — і яна
Ручаём ізноўку забушуе.

◈ ◈ ◈

Вясна не ведае няўпраўкі...
У кволым снезе раўчукі
Адзін з адным у даганялкі
Гуляюць, быццам хлапчукі.

На сонцы песціцца дуброва,
Сышла кудысь далёка стынь...
І ты, душа, ізноў гатова
Любую змераць далячынь.

◈ ◈ ◈

Шар вялізны майскай поўні
Казачным святлом
Хаты, вуліцы напоўніў
І сады кругом.

Ён заліў святлом паляны,
Рэчку, сенажаць...
І на ўсім навокал зманы,
Прывіды ляжаць.

## IX

# А ЯШЧЭ ДАЛЁКА ТОЙ ПАРНАС

### 1

На Парнас-гару ўзлятае хтосьці
На крылатым белым скакуне...
А мая кабылка-сіўка штосьці
Везці не спяшаецца мяне.

З норавам, ужо немаладая,
Скідвала яна мяне не раз...
Я ж кабылку ўпарта падганяю,
А яшчэ далёка той Парнас.

### 2

Гляджу я проста на сваё жыццё.
І мною ісціна даўно адкрыта:
Я для паэзіі — не набыццё,
А мне яна — ого які набытак!

Я без яе пражыць бы — не, не змог,
Паэзіяй жыцця праявы меру...
І мо знайду я хоць адну з дарог
Да чытачоў сваіх, да іх даверу.

### 3

Даводзіць муза мне заўжды адно:
«Маўчы, пакуль натхненне не патрэба

Такая ж, быццам пітуну віно
Ці згаладаламу — скарынка хлеба.

Маўчы! Нічога не пішы зусім,
Знайдзі ты іншы для сябе занятак,
Пакуль не ўбачыш коласам тугім
Слоў назбіраных — залатых зярнятак!»

**4**

Калі пішуцца вершы ўдала,
Дык гатовы паверыць я,
Што ў паэзіі ўжо зазззяла
(Ну нарэшце!) зорка мая.

Але гэту ў сябе ўлюбёнасць,
Як натхненне маё міне,
Адбірае злая будзённасць,
А нярэдка і б’е мяне.

**5**

Бывае — з гонарам замшэлым,
Дарма, што сам без барады,
Паэт, загадчык літаддзела,
Сцвярджае: «Шмат, браток, вады...»

І хоць надорыцца ўзаемнасць
(Куды ж падзецца ад «вады»?),
Мо гэта ты, непаўнацэннасць,
Бяздарнасць, можа, гэта ты?

**6**

Але ў натхнёную часіну
Зноў кланяюся я сталу,
Ноч навылёт згінаю спіну
І дадаю маршчын чалу.

Не змерадь катаржнай работы,
Павек яе не скончыць мне…
Мае няве'ре і сумота,
Прэч уцякайце ад мяне!

**7**

У кожным генія шукаю,
Усім я годнасці надам.
І мушу думаць у адчаі,
Што ні на што не здольны сам.

Няма ў душы заспакаення:
То адпраўляюся ў палёт,
А то ў наступнае імгненне
Разбіты музы самалёт.

**8**

Душа навек паэзіяй працята.
Шчаслівы я і разам з тым бядак,
Бо вось ізноў не тая нота ўзята,
Зноў пеўня даў няўдачлівы спявак.

Але не трэба мне інакшай долі,
Сваю пуціну бласлаўляю я…
Жыццё маё! Цярпенню ў тваёй школе
Вучылася паэзія мая.

## 9

Вершы — гэта быццам бы кароста,
Той жа сверб, ды ён хвалюе кроў…
Тэм для напісання вершаў множства,
Ды на ўсе няма патрэбных слоў.

А калі радкі ў душы запелі —
Верш іскрыцца, большае напал…
Я — салдат, які падбег да цэлі
І гранату кінуў…
Ці ж папаў?

# X

# КАЛІ Ў НЕБЕ ПЛАВАЮЦЬ ДЭЛЬФІНЫ

## ПЕРШ ВЕРШ

Пугай біў мяне пастух,
Кідаў злыя словы:
«Як жа ты, смаркач, лапух,
Разгубіў каровы?»

Як жа здарыўся той грэх?
Быў я вінаваты —
Верш складаў (ну, ці ж не смех?),
Першы верш кілзаты.

А каровы — ў самапас,
Зніклі ўсе з паляны…
Так за вершы ў першы раз
Быў я пакараны.

Многа з той пары дарог
Я прайшоў са словам,
Ды не ў кожным вершы змог
Упасвіць каровы.

◈ ◈ ◈

У трыццаць год не выбіраюцца,
Ужо ідуць у трыццаць год

І нават трошкі падбіваюцца,
Але не прыпыняюць ход.

А ты не знаеш стомы гэткае,
Яшчэ няўпэўнены ў хадзьбе...
Што ж — будзеш мемуарным сведкаю
Сяброў, што абышлі цябе.

## АДНАМУ ПАЭТУ-КРЫТЫКУ

«Перш, чым узяцца за пяро...» —
І пачынаеш, пачынаеш...
І свой артыкул не дабром —
Адною ганьбай начыняеш.

Імёнаў цесныя рады —
Як на аб'яве ці афішы...
Б'еш маладых удала ты.
Але з цябе паэт ці выйшаў?

## ПУСТАБРЭХ

«Дапамагу заўсёды, брат», —
Казаў знаёмы пры народзе...
І вось — дапамагчы ён рад,
Але ўсё часу не знаходзіць.

А справы — гэта ж проста смех! —
Адзін званок па тэлефоне...
Ды цэлы месяц пустабрэх
Адно што языком і звоніць.

## НАЧНАЯ СУСТРЭЧА

Чацвярым ішоў насустрач.
І было ўсё, як у сне:
Крайні з іх, мо самы шустры,
Б'е па сківіцы мяне.
І на момант пацямнела
Ад таго ў мяне ўваччу.
І крычу я ачмурэла:
«Ты за што?!» —
Услед крычу.
Ды не можа ведаць жалю
Гэта подлая братва...
У адказ хіхікаць сталі.
Ах, вы, думаю, блатва!
Згледзеў камень у імгненне.
Кінуў. Хтось ад болю ўзвыў.
Я ж — у двор, у ноч, у цені...

Гаварыце, што каменне
Я за пазухай насіў.

## СОН

У небе плавалі дэльфіны,
Дурэлі, бы ў вадзе марской.
І вось між імі тры жанчыны
Павіслі раптам нада мной.

Яны зусім неспадзявана
Спусціліся — і хваць мяне,
І ўгору цягнуць... «Э, шчэ рана
Туды, на неба, любкі, мне».

Жартую так і ўніз я рвуся,
Спусціўся — іх няма нідзе...
Я сон разгадваць не бяруся,
Бо мне ад жонкі пападзе.

◈ ◈ ◈

Аднойчы выдалі мой грэх
Начальству школы аднагодкі,
І я ад кары ўцёк да цёткі,
Узяўшы кніжак ледзь не мех.
А хлеба ўзяў мо з гулькін нос.
«Што за прапорцыя такая? —
Сказала цётка, ўспамінаю. —
Ты б лепш наадварот прынёс».
Аднак прышэльца прыняла,
Бо знала цётка, што на трошкі
Мне хопіць аграмаднай ношкі...
Праз тыдзень я пайшоў з сяла.
Да кніжак прага павяла.

## БРЫДКАСЦЬ

Добра грошы выманьваць умее
Непаголены брудны суб'ект:
Што ні слова — дык кропля ялею,
Што ні поза — дык б'е на эфект.

Даў я сотню яму без прынукі
І не стаў павучанняў рабіць...
Ды чамусь захацелася рукі
Пасля гэтай аддачы памыць.

## МАНАЛОГ П'ЯНІЦЫ

Закусваць можна розным чынам,
Абы жаданне ў тым было.
Зайшоў учора ў магазін я
І сцібрыў каўбасы кіло.

А сёння ў булачнай ад булак,
Ад боханаў наскуб шматкоў.
Зайшоў з «чарнілам» у завулак,
Кульнуў, заеў і — будзь здароў.

А заўтра зноў знайду, вядома,
Я адпаведны рацыён:
Пайду ў сталоўку да знаёмай...
Што закусь! Быў бы выпівон.

## СУСТРЭЧА

Сустрэў знаёмага, якога
Не бачыў, пэўна, дзесяць год.
Ні то ўсміхаецца нябога,
Ні то ад болю крывіць рот.

«Ты што, браточак, не ў гуморы?
І рукі быццам бы дрыжаць...»
«Але, — тлумачыць ён. — Я хворы».
«Дык да ўрача ідзеш, відаць?»

«Не, вось у гэтую ўстанову, —
Паказвае на магазін. —
Давай з табою напалову,
Бо грошай не збяру адзін».

«Я вельмі рады запрашэнню,
Ды я спяшаюся, бывай!»
А ён: «Тады гані мне пеню —
На куфаль піва грошай дай!»

## КАЛІ ЗА ПЯЦЬДЗЕСЯТ

Набірае сілу розум,
Набывае слабасць плоць…
З вершаскладвання на прозу
Пераходзіш самахоць.

Спасцігаеш меркантыльнасць
Навакольнага жыцця
І выгадваеш прыбыльнасць
Праз сістэму набыцця.

## ЛІСТ СЯБРУ

**Жарт**

Вясёлых песень болей
Не пецъ мне, мілы мой.
Мяне жыццё няволіць
Рутынаю сваёй.

Ніхто не скажа: «Годзе!
Сядай за свой блакнот…»
Такое, брат, не ў модзе,
І свет на гэта жмот.

Я дужа канцылярскім,
Здаецца, стаў, браток.
І знік мой пыл бунтарскі,
Застаўся мо пылок.

Адно папер маранне,
Не знаеш — для чаго…
Вось, брат, і ўсё пасланне
Ад сябрука твайго.

Але жыві надзеяй,
Хай буду жыць і я,
Што успыхне новай веяй
Паэзія мая.

◈ ◈ ◈

Як не стане з роднай жонкай ладу,
Завяду каханку я сабе…
Клюну я, як рыба на прынаду,
На красу ці маладосць яе.

Загуляю. Многа весялосці
З ёй спазнаю ў якасці раба
Аж датуль, пакуль не прыйдзе ў госці
Новы сум ці новая журба.

## ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА

«Гэта ты, — крычу, — Наташа?»
Грубы голас у адказ:
«Тут няма знаёмай вашай…
Ды не будзе хай і вас».

Гэта што яшчэ за гумар!
Але сэрца ў страху — торг.
«Што, не той набраў я нумар?»
«Той, калі вам трэба ў морг».

Кінуў я ў спалоху трубку —
Мне туды не трэба, любка.

◈ ◈ ◈

Як я хацеў у маладосці
Надрукавацца ў «Маладосці»!
Чытаў паэт Аўрамчык першы
Кіло напісаных мной вершаў.
І, добрую спазнаўшы муку,
Пяць ледзьве выбраў ён для друку.
Ды, быццам нейкія караўкі,
Убок адкінуў іх Бураўкін.
Пасля адумаўся рэдактар —
Пакінуў тры...
А вось post faktum:
З маёй падборкай — вось дык Леў! —
Часопіс значна пахудзеў.

## З МІНУЛАГА

Тварыў уночы, ўдзень і ўвечар,
Але дарма стараўся я:
Мяне Грачанікаў адпрэчваў,
Не прызнаваў мяне Шаўня.

І да Аўрамчыка Міколы
Бег у прызначаныя дні
Я ад грачанікаўскай школы,
Ад пункту гледжання Шаўні.

Быў я ў Аўрамчыка не ўломак,
Ён абуджаў душу маю —

Як самалёт з аэрадрома,
Яна сягала ў вышыню.

## САМОТА

Восень. У дуброў і ніў
Выгляд не эдэмскі...
Пад бярозаю застыў
Сумны Леў Парэмскі.

Ён шкадуе аб гадах,
Што прайшлі ў гуморы...
А над ім чарнее птах,
Крумкае каторы.

Птах закрумкаў, забасіў:
— Што ты як не плачаш?
Мо харошых перспектыў
Для сябе не бачыш?

Дык прарочу я: няхай
Маладосць пражыта —
Заквітнее ў сэрцы май
Радасцю забытай!

І па-новаму ў жыцці
Будзе ўсё прапета...
А Парэмскі:
— Прэч ляці
Ты з прароцтвам гэтым!

Не прароцтва — варажба
Мне твой крык дзябёлы...
І Парэмскаму журба
Гне ўсё ніжай голаў.

А крумкач у дальні гай
Пацягнуў ад поля,
Толькі крыкнуў ён:
— Бывай,
Вер шчаслівай долі!

А ў нябёсах — каб прасвет,
Што душу галубіць...
Ды памарым, што паэт
Галаву не згубіць.

◈ ◈ ◈

Стану ці не стану дзедам —
Ці дажыць да той пары —
Покуль не здаюся бедам,
Шчэ ў душы агонь гарыць.

Хоць тры кнігі толькі маю,
Я пазіцый не здаю,
Да душы сваёй адчаю
Падступіцца не даю.

◈ ◈ ◈

Паставіць Час усіх па рангу
І, як ні горка ўсведамляць,
Быць можа, мне на левым флангу
Між творчай брацііі стаяць.

На Час я крыўдаваць не стану.
Як ні распарадзіцца ён —
Любому пакаруся стану...
Час — найгалоўнейшы закон.

# XI

# ПАЭМА АБ НЕСВЯДОМАСЦІ

### **Уступ**

Каля вёскі — здратаваны дол
І акопы з белымі касцямі...
Чэрап чалавечы, як футбол,
Падбіваюць хлапчукі нагамі.

Адышла з вайной пара нягод,
У футбол гуляць усюды воля...
Чарапамі лініі варот
Шчэрацца на тым футбольным полі.

Папаліла ўсе мячы вайна,
Што ж — затое чарапоў багата...
Добра ты здалёку мне відна,
Жыццяў і спагадлівасці страта.

### Глава І
### **Навала**

**1**

Заглушалі громам стрэлы
Галашэнне і маленне,
Млелі, курчыліся целы,
Падгіналіся калені,

Кулі пырскалі крывёю —
Смерць усіх валіла долу…
І вялізнаю труною
Сталася людзям стадола.

**2**

Аб расстрэлах — пакуль здалёку —
Прыляталі ў вёску навіны.
Ды як быццам навідавоку
Жаху бачыліся карціны.

Набівалі дзецьмі мяшкі.
Шмат набралася цыганятаў…
Пацяшаючыся, стралкі
Забівалі іх з аўтаматаў.

А бацькоў ужо не было,
А бацькі пра гэта не зналі…
…Усю ноч гарэла цяпло,
Немцы з табарам балявалі.

А як згінула ноч маны
(«Не кранём вас пасля гулянкі…») —
Цяжка падалі цыганы,
Паміралі тлумна цыганкі.

І гудзеў навакола бор
Пад жахлівы енк цыганятаў —
Бы выказваў катам дакор,
Бы кагосьці зваў да адплаты.

### 3

Гэта ў нашых было мясцінах,
Дзе з крывёй зямля перацёрта...
Там, дзе я выпадкова не згінуў,
Ды загінуў кожны чацвёрты.

Вір клубіўся... Немаўляты
Не ўсплывалі з цёмных спрат...
Іх тапілі ў рэчцы каты,
Іх тапілі ў рэчцы каты,
Немаўлят — як кацянят.

Рэчка злосна булькацела,
Вадзяны клубіўся пыл...
І ляцелі цельцы ў белым,
І ляцелі цельцы ў белым —
Быццам чаіцы без крыл.

Добра маткі спавівалі,
Каб было не мулка ім —
Саванам пялюшкі сталі,
Саванам пялюшкі сталі
Немаўляцікам усім.

Каты ўмела ўсё рабілі,
Кожны быў душой вампір —
Немаўляткамі гацілі,
Немаўляткамі гацілі
Рэчкі самы страшны вір.

### 4

А ў другой мясціне
Ясным днём улетку

Мужыкоў забілі,
Заадно — падлеткаў.
А потым...
А потым ад роспачных матак
Яшчэ адарвалі дзяцей-немаўлятак...
Загналі астатніх усіх у адрыну...
Агонь усхапіўся над ёй у хвіліну.
І маткі не ведалі ў полымі, ў дыме,
Што робяць нягоднікі з дзецьмі малымі.
А тыя іх кідалі у самыя пашчы
Аўчарак, што суткі праседзелі нашча...
А маткі гарэлі, а маткі не зналі,
Што іх дзіцянятак аўчаркі ірвалі,
Матлялі ў раз'ятраных пашчах сваіх
Марысек, Алесек і Петрыкаў іх,
Што нелюдзям з гэтага выйшла пацеха,
Што стогнам на ўсё адгукалася рэха,
Што сонца схавалася раптам за хмары
І смутак сышоў на лясныя абшары.

**5**

Падступала бліжай вайна
Зарывамі, стралянінай...
І да нас нарэшце яна
Прыйшла па даніну.

Лазня ў вёсачцы стаяла
Каля самага балота.
Добра стому выдаляла
Яна з целаў разам з потам.

Печка хораша гарэла
І напальвала каменне...

Ой, як добра млела цела,
Калі клалася пад венік!

Ах, як весела шугала —
Зразу ў столь — пякучка-пара!..
Толькі ж лазня а ці знала,
Што аднойчы стане карай.

Тых, каго так добра мыла,
На палку лячыла ў сушы, —
Трох мужчын яна паліла,
Чарнатой спякала душы.

І глядзець на гэту кару
Нас прымусіла навала —
Аж пакуль пякельным жарам
Лазня з косткамі не стала.

## Глава II
## Тата

Балела сэрца ад чужой бяды,
Ды асабліва — ад уласнай страты…
Калі было мне толькі тры гады,
Не стала таты.

### 1

Мне бачыцца чырвоная машына,
У кузаве вялікі гурт дзяцей.
Я тату зверху штось крычу, ды сына
Не чуе ён з-за гаманы людзей.

Адно махае мне ў адказ рукою —
Маўляў, глядзі на свята, не зявай…

І чырванню сцягоў і вышынёю
Маленькага шчасліваць Першамай.

І вось пачаўся рух, сцягі мільгаюць…
Машына з неспакойнаю дзятвой
Заходзіць у калону Першамая —
І застаецца ў памяці маёй.

**2**

Каня купіў мне тата ў магазіне
І з дошак горку зладзіў ля сцяны…
Як высака было на конскай спіне,
Як мчаў мяне з той горкі вараны!
А я хапаўся за аброць, за грыву,
Ды не ўтрымаўся — грымнула вайна
І пашчапала варанога ўзрывам,
І ў тату хутка стрэліла яна.

**3**

Яшчэ ўспамінак. На веласіпедзе
Да роднага мястэчка мы з гасцей
У прыцемку пацíху едзем-едзем,
Утульна мне ля татавых грудзей.

Пад колы шлях — прасёлкам, сцежкай, гаццю,
Лагодзяць летні ветрык, цішыня…
Ды што апошні раз я еду з бацькам,
Не ведаю яшчэ я, хлапчаня.

А дрэвы нам працягваюць галіны,
І ветрык лашчыць — цёплы і ляны…
І вось у нашу хату па даніну
Прыходзіць раніцою здань вайны.

### 4

«Ён вернецца», — сказалі двое ў шэрым,
Ды не здаліся добрымі людзьмі…
О, як я ім, узброеным, не верыў,
Як захліпнуўся горкімі слязьмі!

Як адчуваў, што таты ўжо не стане,
Як адарвацца ад яго не мог!..
І пачалося жуду нарастанне,
Ледзь толькі ён памкнуўся за парог.

І на вачах, знянацку, ў спіну — стрэлы.
Хіліўся ён на снег ужо ў цішы…
І зразу сцежка там зачырванела
Ад цеплыні даверлівай душы.

## Глава III
## Уцёкі

А вайна не знае стрыму,
Пракладае ўсюды след…
Многа ў ёй агню і дыму,
Многа шалу, многа бед.

### 1

Гарматы б'юць. Сон перарваны.
Абстрэл. Пярэпалах. Паўзмрок.
І тупат ног. І нечы лямант…
А лес — ужо непадалёк,
Мільгае першымі кустамі.
І вось прымае ўцекачоў
І замыкаецца за намі
Сцяною волатаў-дубоў.

Гушчар прыцішвае трывогу.
І нас ля прывіда-карча
Кладуць матулі спаць пад рогат
Ляснога д'ябла — пугача...
Назаўтра — не былі б мы дзеці —
Нядаўні страх аддаўшы сну,
Ужо гуляем у вайну...
Яна ж гуляе па ўсім свеце.

**2**

Паміраць каму ахвота?..
«Немцы», — быццам стрэліў крык.
Замільгалі лапці, боты,
Мчаць у багну, у балота,
Неймаверны спуд узнік.

І матуля мчыць зацята —
Не адстаць бы ад усіх.
Ды адна рука — пад братам,
А другая — мной занята.
Уцякаем утраіх.

Сёстры дзесьці ўжо далёка,
Страх і нас наперад мчыць.
Толькі лес навідавоку.
Што наперадзе, што збоку —
Не ўглядзецца, не ўсачыць.

Толькі дрэваў мільгаценне.
Не стрымаў ламачча груд.
Пад нагамі — глей, карэнне,
Нешта сцягвае адзенне,
Не дае спыніцца спуд.

Ды глядзім: шаша прад намі,
Знемагліся мы, стаім…
Чуем — коні за кустамі
Б'юць па бруку капытамі,
Бачым — коннікі на ім.

Бачым — на фуражках зоркі,
Пісталеты ў кабуры…
…І зрабіў той час не горкім
З лёгкім прысмакам махоркі
Падарунак — сухары.

## Глава IV
## Палон

Я мог ляжаць у чорнай яме,
Я мог згарэць з усім сялом…
Вайна паводзіла ствaламі,
Шугала полымем кругом.

Яна вісела змрочным ценем,
Чарніла скрозь нябёсаў сінь…
О, толькі цудам стала меней
Пад небам на адну Хатынь!

### 1

Смерць не была нікому дзівам,
Жылі ўвесь час мы побач з ёй…
Ды стаў аднойчы я шчаслівым
Па несвядомасці сваёй.

Мне шчасце… немцы падарылі,
Калі прыехалі ў сяло.
Яны па-руску гаварылі
(Не ўсе — такіх няшмат было).

І я, маленькі, нейкім чынам
(Якім — не ў сілах прыгадаць)
Здружыўся з іх вышэйшым чынам,
Стаў дзядзькам Сцёпам называць.

Відаць, у чына-камандзіра
Быў сын, падобны на мяне,
І сэрца пад чужым мундзірам
Няўзнакі спагадала мне.

Казарма ў доме бабы Ганны
Была, і я туды ішоў,
Цікаўнасцю да зброі званы
І да цукерачных мяшкоў.

А да мяшкоў, бадай што, болей,
Бо ласы да цукерак быў.
Мне іх дарылі, ды ніколі
Не задавольваўся я тым.

Мой кулачок — такая доза
Была ваенных тых дароў.
І сэрцам заўладала кроза:
Займець бы колькі кулачкоў!

І вось вячэрняю парою
Адбыўся партызан напад…
Хапаюць мае немцы зброю
І пад павець бягуць, у сад.

«Заб'юць! Лажыся!» — крыкнуў жудка,
Штурхнуў мяне мой дабрадзей…
Ды мне, аднак, зусім не пудка
Ляжаць пластом каля дзвярэй.

Хоць страляніна скрозь густая,
І хоць трасірка праз акно
Імгненна хату працінае,
Ды мне не страшна ўсё адно.

Займець цукерак шмат жаданне
Перабівае смерці жах...
Краду цукеркі — і змярканне
Мой сорам тоіць на шчаках.

Кішэнькі смакатой набіты,
Яна выглядвае адтуль...
Як тут жахацца быць забітым,
Асцерагацца дзе тут куль?

З ласункам трэба мчаць дадому
Пакуль ідзе, грукоча бой,
Каб часу не было нікому
Сачыць за злодзеем — за мной.

Ды толькі выткнуўся за дзверы,
Як зноў «Лажыся!» крык чуцён...
Ляжу і шлях да вулкі меру
Вачыма — невялікі ён.

І вось ускакваю, рукамі
Кішэнькам робячы падпор...
Трасіркі яркімі жукамі
Ля галавы лятуць праз двор.

Ад іх, ад сораму ўцякаю,
Раблю на вулку паварот,
Бягу, ды раптам заўважаю
Перад сабою мінамёт.

Бой заціхае нечакана,
І двое, кінуўшы страляць,
Мяне здалёк неспадзявана
І ўважна сталі разглядаць.

Рук не адняўшы ад кішэнек,
Ужо я не бягу — іду,
І сэрца точыць разуменне,
Што могуць стрэліць, я ўпаду —

І ўсё адкрыецца... Жахліва
Цяпер во толькі стала мне,
Бо двое ўчэпіста надзіва
Не зводзяць позіркаў з мяне.

Дарога быццам стала вязкай,
І на нагах — бы сто пудоў...
Хутчэй ужо была б развязка:
Ці стрэл, ці шпаркі бег дамоў.

Вось побач мінамёт і двое,
Вось я да іх ужо спіной...
Не стрэляць? Стрэляць?.. І жудою
Няяснасць вісне нада мной.

Аддацца бегу я рашаю,
Хай стрэляць — мо не пападуць...
Бягу і стрэлу я чакаю,
І — ззаду застаецца жудзь.

Ратункам стала падпамосце
Для дамачаднікаў маіх...
Нібыта з таго свету госцем
Я ўскочыў, радасны, да іх.

І стрэчу песцяць пацалункі
(Жывы! Жывы сярод жывых!)...
І смачна смокчуцца ласункі...
Мне сёння горкі прысмак іх.

**2**

Няўдалы партызан напад
Раз'юшыў прыхадняў атрад.
Прынята хуценька было
Рашэнне пакараць сяло...
Але аб тым не знаю я,
І справа ў хлопчыка — свая.

Немцы, чуў я, загадалі
Выязджаць праз паўгадзіны...
З хат выносіць людзі сталі
Ношкі, коўдры і пярыны.

Маці ў гэтым бачыць гора,
Сёстры ў скрусе стрэлі вестку...
Толькі я, хлапчынка, зборам
Рад у нейкую паездку.

Абягаю я суседзяў
З дзіўным у нагах імпэтам:
Чую — ў нейкі лагер едзем,
Чую — лагер той за светам.

Вось нясуць каністру немцы,
Заварочваюць да хаты,
Льюць на сцены нешта ў сенцах,
Праз акно туды — гранату.

Патыхнула з сенцаў жарам
І ўся хата — ў гуле, ў хрусце
Палымнее, ды пажарам
Я не ўстрашаны чамусьці.

Хай гарыць, цяпер жа можна —
Нам дадуць жыллё другое...
І ў натоўпе не трывожна
Мне цягнуцца пад канвоем.

Несвядомае імкненне
Дорыць гэтулькі настрою!
Я чакаю адпраўлення,
Падарожжам толькі мрою.

А народ, натоўп так строга
Немцы ззаду падганяюць...
Але страшнага нічога
Покуль я не ўсведамляю.

Немцы ж везці анікуды
Не збіраліся нікога...
Мелася адна пракуда —
На расстрэл вяла дарога.

**3**

На самы большы агарод
Сагналі карнікі народ.
І бранявік наставіў рулі.
Вось-вось адтуль удараць кулі.

— Дзеткі, не бойцеся, — мама казала. —
Куля кусае, як пчолкіна джала...
— Мама, упадзём мы?

— Са мной упадзеце.
— Жыць больш не будзем?
— Будзем…
У іншым жыць будзем мы свеце.

Штурхаюць немцы, «Рус свіння!» — крычаць
На просьбы ўсе, на кленчанне, рыданне…
Не могуць шал іконы ўтаймаваць,
Што выстаўляюць спераду сяльчане.

Хоць, як усім, было страхотна мне,
Злаваўся я, што не займеў гранаты:
«Была б яна — зазналі б вы ў мяне!..»
Больш грознай не прыдумаў я адплаты.

І, быццам бы адчуўшы злосць маю,
Ад'ехаў бранявік — страляць не будзе!
Апамятаўся — бачу, што стаю
Я там жа. Побач — маці, людзі.

І ўжо няма навокала падстаў
Для енку і для злоснага штурхання —
Хтось важны на ад'езд каманду даў…
І зноў прыйшло жыццём замілаванне.

Не мог нічога я асэнсаваць,
Ды што б дало маё асэнсаванне…
Вайна рашыла трохі пачакаць —
Павезла ў іншы кут на пакаранне.

Каб не ўцяклі, на сані, на вазы
Нас пасадзілі немцы невясёла.
І зарыпелі ўцешна палазы,
Затахкалі па маласнежжы колы.

## Глава V
**Вясёлая паездка**

Адбылася ўсё ж паездка
Па загадкавай прычыне…
Зноўку радасная вестка
Падняла настрой хлапчыне.

Між дзяцей сяджу на возе
І адно я толькі знаю:
Мчацца хвацка да дарозе.
І каня я знай хвастаю.

«Гут!» — чуцён мне вокліч немца
Маладзенькага з канвою.
Ён маленькаму шаленцу
Паддае шчэ больш настрою.

Абганяю ўсіх без страху,
Большага няма шчасліўца…
Ды падскочыў, б’е з размаху
Дзядзька-возчык дурасліўца.

Я не плачу. Вінаваты.
Не ўстрымаўся ад учынку…
Дагараюць ззаду хаты,
Падарожжу рад хлапчынка.

Што ж, гадкоў яму нямнога.
Людзі, вы яму паверце:
Ён не знае, што дарога
Скіравана ў лагер смерці.

## Лірычнае адступленне

Ужо сказаць пара наспела,
Хто ўратаваў нас ад расстрэлу,
Хто адмяніў тады загад...
Вось што паведаў дзед Ігнат.

«Гэта пад зіму было ці зімой.
Карнікі сталі ў дамах на пастой.
Хата, дзе Ліда-красуня жыла,
Іх камандзірам абрана была».
(Гэта я з ім падружыўся няўзнак.
З дружбы дабра было мала, аднак.)
«Муж маладзіцы на фронце дзесь быў,
Ведалі ўсе — камандзірам служыў.
Карнік пра тое ці знаў, ці не знаў —
Рускі, ён зразу яе пакахаў».

З аднавяскоўцам гаворку вяду —
Бачу выразна былую бяду.
Хаты палаюць. І лямант, і крык,
Рулі ў людзей скіраваў бранявік...
Смерць падступае бліжэй і бліжэй.
Ліда не зводзіць з натоўпу вачэй.
Карнік жыццё дараваў толькі ёй.
Цяжка, аднак, заставацца жывой,
Цяжка ёй слухаць людское выццё,
Сорамна за падарунак — жыццё...
Кінуў да карніка Ліду адчай,
Моліць: «Не трэба! Людзей не страляй!»
Здзіўлены карніка строгі пагляд:
«Нельга. Бо з немцаў амаль што атрад.
Рускіх мо болей за нейкую чвэрць.
Я не хачу зарабляць сабе смерць».
«Хай сабе немцы, ты ж — іх камандзір.

Гэткі ж, як немцы, ты носіш мундзір».
«Так. Але іх найгалоўны закон.
Тут не застрэляць — заб'е гарнізон».
«Жыць тады болей не хочацца мне,
Разам з усімі страляй і мяне!»
Стала з усімі рашуча яна.
Мужнасць жанчыны натоўпу відна.

Ліда змяніла сяльчан усіх лёс...
Вёз нас па лесе журботны абоз.
І, каб ахвяры ўцячы не змаглі,
Карнікі, возчыкі пешкі ішлі.
Ззаду пажар заставаўся і жах.
Ехала Ліда ў пярэдніх санях.
Карнік галоўны ішоў ля саней,
З мілай ахвяры не зводзіў вачэй.

Так мы тады пазбеглі скону.
Прывезлі ўсіх да гарнізону.
Той пагрузіў нас у састаў
І ў лагер смерці скіраваў.
Ды шлях, пакутны і нязнаны,
Перапынілі партызаны,
Адбілі боем эшалон —
І наш закончыўся палон.

## Глава VI
## Партызанскімі сцежкамі

Помню час, калі ў муках, самотныя,
Мы ішлі партызанскай дарогаю,
І калі ад блакад засцярогаю
Станавіліся твані балотныя,
І калі ў сваіх сховах пад шатамі
Лес карміў нас ядою нішчымнаю,

І калі буданы нашы дымныя
Нам здаваліся утульнымі хатамі...

**1**

Там, дзе цякла ў гушчэчы рэчка,
Куды мы збеглі ад вайны,
Пафарбаванае яечка
Мне ў велікодны дзень далі.

Глядзі, маўляў, якая казка!
Цяцерка знесла пад кустом...
Бабуля добрая Параска,
Была ты слаўным ілгуном!

І даражэй, чым залатое,
Было яечка для мяне...
Яно блакаднаю парою
Душу і рукі грэла мне.

**2**

То не лісця шэпт у лясах,
То не ветру пошум у полі —
То гучыць у мяне ў вушах
Голас мацярынскага болю.

— Праклінайце, людзі, мяне,
Шліце ўслед мне дакоры, кпіны...
Так і трэба, напэўна, мне —
Я свайго атруціла сына.

...Хворы быў цёткі Тоні сын,
Ён крычаў бясконца ад болю.

І ён мог загубіць адзін
Каля сотні людзей ці болей.

І тады, блакаднай парой,
На сухой палянцы ў балоце
Цётка Тоня сваёй рукой
Яд сыпнула ў маленькі роцік.

Санітарка, знайшла яна
Чым спыніць хлапчука пакуты…
Не пайшла ў балота вайна,
Перамог парашок атруты.

Нас ніводзін не выдаў гук,
Нас таіла балота сурова,
Ды знямеў назаўжды мой сябрук —
Цётчын Тонін Вова.

То не лісця шэпт у лясах,
То не ветру пошум у полі —
То гучыць у мяне ў вушах
Голас мацярынскага болю.

— Праклінайце, людзі, мяне,
Шліце ўслед мне дакоры, кпіны…
А маё праклятце — вайне!
То яна атруціла сына.

## Лірычнае адступленне

Балоты. Наш ратунак. Сцежкі. Кладкі.
Ішлі, паўзлі між патаемных вех
Па купінах, па твані без аглядкі,
Бо ззаду стрэлы чуліся і брэх.
Вялі балоты ў тайныя мясціны,

Нам спагадалі заўсягды ў бядзе...
Жывуць і сёння там мае ўспаміны —
Бы зноў брыду па хлюпкай той вадзе.

Сястра мая! Пакутніца малая!
Якім нялёгкім лёсу быў прымус!..
Вось бачу я: ты на плячах трымаеш
Мяне малога — неймаверны груз.
Мне пяць гадоў, табе крыху за дзесяць.
І груз такі — у гэтакую рань!..
Ішла і бегла ты са мной па лесе,
Са мною зашывалася і ў твань.
Не змерыць мне павек тваю абузу,
Не мог яе тады ўсвядоміць я...
І давіць памяць неймаверным грузам
На сэрца сёння, любая сястра!

## Глава VII
## Пасля ліхалецця

Ужо баі скрозь адгучалі.
У пыле, ў духаце дарог
Палонных немцаў густа гналі,
І змора іх валіла з ног.

Ісці не ў сілах за калонай,
Забінтаваны, з кавялой,
Сеў на абочыну палонны,
Замёр з пахілай галавой.

А канваір хвілінай тою,
Яшчэ як быццам на вайне,
Зняў аўтамат і ўміг чаргою
Прайшоўся па яго спіне.

І галавой у дно кювета
Палонны ткнуўся ўжо без мук...
І з болем цікаваў за гэтым
Я, ля шасці гадоў хлапчук.

Я крыкнуў: «Дзядзечка, не трэба!»,
Ды апярэдзіць не паспеў...
Было такім блакітным неба,
Так пыл дарожны пяткі грэў.

А ён ляжаў, у крук сагнуты,
Забіты ўжо не на вайне —
І ў сэрца ўдарыла пакута,
Яшчэ не ведамая мне.

Ішоў, паранены, бяззбройны,
Не замінаў нікому ён...
За што ж забіў яго канвойны,
Каму патрэбен гэты скон?

Смярцей я дужа многа бачыў,
Шмат гора зведаў з-за вайны,
А тут зайшоўся раптам плачам
З-за несвядомае віны.

**Эпілог**

Вось мне гавораць: «Ну, была вайна...
Забудзь, даўно ж прайшла часіна тая...»
А мне здаецца, што ідзе яна,
Бо ў памяці штораз уваскрасае.

Я быццам несапраўдны чалавек,
Жыве ў душы пакутная загана —
Сябе я адчуваю ўвесь свой век
(Зганялі ж на расстрэл нас) расстраляным.

## ЗМЕСТ

**I**

**Не пагасі зару, мой свеце!** .......... 4

**II**

**Тут усё дарагое** .......... 7

**III**

**Што ты накануеш мне, жыццё?**

* * * Мая душа — нібыта поры года… .......... 15
* * * У кожнага свае заўжды памкненні… .......... 15
* * * Калі бядотаю сваёю… .......... 16
* * * Я палёгку ў жыцці… .......... 16
* * * Як прагну я ў жыцці прасвету… .......... 17
* * * Прах дарагі зямля накрыла… .......... 17
* * * Як баюся ўбачыць пустату… .......... 17
* * * Адхацела сэрца, адхацела… .......... 18
* * * Не знімеш, быццам ношку, груз гадоў… .......... 18
* * * Ні зроку, ні зубоў, ні кучараў былых… .......... 18
* * * Што шкадаваць аб валасах… .......... 19
* * * Восень… .......... 19
* * * Мне лёс не дорыць святаў і прыўкрас… .......... 19
* * * А як дасягнуць апагею… .......... 20

**IV**

**Меланхалічныя вершы**

* * * Жыццё — быццам мора… .......... 21
* * * Я знаю, смерць такая пустата… .......... 21
* * * Хтось тайны шэпча мне… .......... 22
* * * Не спыніць навокал шматгалосся… .......... 22
* * * Дай спакою адцурацца… .......... 22
* * * Хоць і быў на краю магілы… .......... 23
* * * Жыць — дорага, памерці — не танней… .......... 23
* * * Караці, жыццё, кароткі век… .......... 23
* * * «Жэрабя кінута!..» — сэрца рашучасцю… .......... 24
* * * Вунь як дуброву вецер шкуматае… .......... 24

## V

### Вечны свет пераўтварэнняў

* * * Можа ўсё змяніцца сёння… ....................................25
* * * На пень бярозавы стары… .......................................25
* * * Вось і старт… ..................................................................26
* * * Нож бульдозера звальвае грушу… ...........................27
* * * Ад грымотаў куст не знаў спакою… ........................27
* * * З гадамі пакахаць усё цяжэй… ...................................27
* * * Старэйшы брат на выгляд не старэй… ......................28
* * * Дом зносяць, крышаць — і з усіх бакоў… .................28
* * * Змывае вечнасць пакаленні… ........................................29
* * * Пралятталі гады, не сачыў я за імі зусім… ...............29
Падманны надпіс ......................................................................30
* * * Апусцела хата, двор маўклівы… ....................................30
Пра дзеда і ўнука ......................................................................31
* * * Ты зведала пакут задужа… ............................................31
Тым, каго пераносяць за горад ..............................................32

## VI

### Штрыхі да штрыха

Згадка пра М. Багдановіча ......................................................33
Сустрэча ў аўтобусе ...................................................................33
* * * Спраўна выйшла!.. ..................................................................34
* * * Рукамі ўзмахваючы, плаўна… ...........................................34
* * * Хлапчук з павелічальным шклом… ...................................35
* * * Ізноў шчаслівае імгненне… ..............................................35
Лыжная прагулка ........................................................................35
* * * Ты навошта выкінула коцікаў… .......................................36
На літаб’яднанні .........................................................................36
* * * Я мора бачыў… .........................................................................36
* * * Як яе не пашкадуеш… .............................................................37
Лінатып ..........................................................................................38
Святая прастата ...........................................................................38
Ткачыха. *Песня* .............................................................................38
Песня штангістаў ..........................................................................39
У адным інтэрнаце .........................................................................40
Неадчэпныя думкі ..........................................................................40

* * * Прачнуўшыся апоўначы... 40
Жонцы 41
* * * Вечныя жончыны ўпікі... 41
* * * Не ўсё прыгожа і трывала... 41
Ветэранам у Дзень Перамогі 42
Слепата 42
* * * Лячу на лёгкакрылым «АНе»... 43
* * * А як бы маці паглядзела... 44
Крадзеж веласіпеда 44
* * * У роздуме, вясна і сонцу рад... 44
* * * Па дарозе коціцца раўчук... 45
Трамвайнае кальцо 45
На шарай гадзіне 45
* * * Мутнее розум чалавечы... 46
Вымушанае знаходжанне на поўдні 46
* * * Ноч і лес на цэлым свеце... 47
* * * Так многа злых было спрадвеку... 48
Ля мемарыялу «Канцлагер Трасцянец» 48
«Купіце дзяўчынку» 48
* * * Мне ў лета бабіна самотна... 49
* * * Моўных я не люблю выкрутасаў... 49
* * * Высноў пляткарскіх крыгі... 50
* * * На свеце тысячы дарог... 50

**VII**

**Не закахацца хіба льга?**

Журавіны 51
Прынамся 52
Спатканне 53
* * * І я малады, і яна маладая... 53
* * * Месячна... 54
* * * Дзяўчыне прыкрае пасланне... 54
* * * Чароўнай дзяўчыны ашука... 54
* * * Дзяўчына мо і не святая... 55
* * * Не любы вы, не любы... 55
* * * Да цябе, да тонкай чарацінкі... 56
* * * Навек я дотык твой запомніў... 57
* * * Быў злы калісьці я на ўсіх людзей... 57

* * * Ці гэта вечар натуманіў… ........................................57
Марыя........................................................................58
* * * Ёсць нешта боскае на твары… ....................................59
* * * Песні раздаюцца на гасцінцы… ...................................60
* * * Туман топіць лугавіну… ...........................................61
* * * Пелі дзяўчаты: «Ой, рэчанька, рэчанька!..»… ..............61
Зімняя элегія.............................................................62

**VIII**

**Шлях ад восені да вясны**

* * * Мятуць навокал тратуары… ......................................63
* * * Апануранын, скалелы… ..............................................63
* * * Туманы абдымаюць прысады… ...................................64
* * * Адгрымелі восені калёсы… .........................................64
* * * Вакол парошы белізна… .............................................64
* * * Як разлінееены разлогі… ...........................................65
* * * Яшчэ паўсюль гуляе смела… .......................................65
* * * Зусім ужо не надзьмуты… .........................................65
* * * Прымарозіў светлы вечарок… ....................................66
* * * Вясна не ведае няўпраўкі… ........................................66
* * * Шар вялізны майскай поўні… ......................................66

**IX**

**А яшчэ далёка той Парнас**..............................................67

**X**

**Калі ў небе плаваюць дэльфіны**

Перш верш.................................................................71
* * * У трыццаць год не выбіраюцца… ................................71
Аднаму паэту-крытыку ..................................................72
Пустабрэх..................................................................72
Начная сустрэча..........................................................73
Сон..........................................................................73
* * * Аднойчы выдалі мой грэх… .......................................74
Брыдкасць ..................................................................74
Маналог п'яніцы..........................................................75
Сустрэча....................................................................75
Калі за пяцьдзесят........................................................76

Ліст сябру. *Жарт* ........................................................ 76
* * * Як не стане з роднай жонкай ладу… .................... 77
Тэлефонная размова ........................................................ 77
* * * Як я хацеў у маладосці… ....................................... 78
З мінулага ....................................................................... 78
Самота ............................................................................ 79
* * * Стану ці не стану дзедам… ..................................... 80
* * * Паставіць Час усіх па рангу… ................................. 80

**XI**

**Паэма аб несвядомасці** ................................................ 81

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Парэмскі** Леў Паўлавіч

Адценні

*Вершы*

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *В. Аскерка*
Камп'ютарны набор і вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктар *В. Аскерка*

Падпісана да друку 15.03.2009.
Фармат 84x108 $^{1}/_{32}$. Папера афсетная. Друк на рызографе.
Гарнітура Times. Ум. друк. 5,67 арк. Ул.-выд. 3,56 арк.
Наклад 100 ас. Зак. 202.

ПУП «Кнігазбор».
Ліцэнзія № 02330/0131712 ад 12.05.06.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск.
**Тэл./факс (017) 204-86-97, тэл. (029) 772-19-14.**

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў друкарні ПУП «Ходр» ГА «БелТІЗ».
ЛП № 02330/0056661 ад 29.03.04.
Вул. Вызвалення, 9, 220004, Мінск.

ISBN 978-985-6930-10-5



*Леў Парэмскі*